ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дармовым дадаткам „Прафрух“)

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., Іншагародніх абвестак—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. надбавак.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74
Сакратар	6-19
Партсэктар	1-80
Сэктар інфармацыі	13-80
Начны рэдактар	6-42
Галоўная кантора	7-81
Аддзел падпіскі	7-81
„ абвестак	7-81

АЎТОРАК 29 красавіка 1930 г. № 100 (3608) Год выданьня — XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

Першая гадавіна сацыялістычнага спаборніцтва

Рабочая кляса дала ўзоры вытворчага гэраізму і энтузіязму

Узьнікшае па ініцыятыве мас сацспаборніцтва дало магчымасьць дабіцца буйных посьпехаў на гаспадарчым фронце

Ад ударных брыгад, праз ударныя цэхі, да ўдарных заводаў—такі шлях творчай актыўнасьці мас

ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ПАРТЫІ РАБОЧАЯ КЛЯСА ЛІКВІДУЕ УСЕ ПРАРЫВЫ ПЕРШАГА ПАЎГОДЗЬДЗЯ І ВЫКАНАЕ ПЯЦІГАДОВЫ ПЛЯН ВЯЛІКІХ РАБОТ У ЧАТЫРЫ ГАДЫ

Да далейшых перамог

«Сацыялізм ня толькі не ўгашае спаборніцтва, а, наадварот, упяршыню стварае магчымасьць ужываць яго сапраўды шырока, сапраўды ў масавым разьмеры, уцягнуць сапраўды большасьць працоўных на арэну нашай работы, дзе яны могуць праявіць сябе, разгарнуць свае здольнасьці, выявіць таленты, якіх у народзе непачатая крыніца і якія капіталізм мяў, зацісканў, душыў тысячамі, мільёнамі». (ЛЕНІН —«Як арганізаваць спаборніцтва»).

Сёньня — першая гадавіна сацыялістычнага спаборніцтва. 29-га красавіка 1929 году XVI КАНФЭРЭНЦЫЯ УсеКП(б) прыняла спэцыяльную адозву да ўсіх рабочых і працоўных сялян СССР. У адозьве канфэрэнцыі гаворыцца: «Для перамогі труднасьцяй сацыялістычнага будаўніцтва, для разгортваньня далейшага наступленьня на капіталістычныя элемэнты ў горадзе і ў вёсцы, для выкананьня пяцігадовага пляну — арганізуйце спаборніцтва ва ўсіх галінах будаўніцтва, арганізуйце спаборніцтва заводаў, фабрык, капальняў, чыгунак, саўгасаў, калгасаў, савецкіх устаноў, школ і больніц».

Сацыялістычнае спаборніцтва не зьяўляецца кампанейскім пытаньнем. Спаборніцтва зьяўляецца штодзённым мэтадам работы. XVI канфэрэнцыя УсеКП(б) у сваёй адозьве гаворыць: «Арганізуйце спаборніцтва за зьніжэньне сабекошту, за павышэньне прадукцыйнасьці працы, за ўзмацненьне працдысцыпліны, за пашырэньне пасёўных плошчаў, за падняцьце ўраджайнасьці, за ўцягненьне сялянства ў калгасы і кааперацыю, за спрашчэньне дзяржапарату і ўзмацненьня яго сувязі з масамі, за паляпшэньне работы культурна-бытавых устаноў, якія абслугоўваюць масы працоўных». Зразумела, што гэтыя задачы пастаўленыя XVI канфэрэнцыяй ня могуць быць выкананы ў парадку кампаніі — для іх выкананьня неабходна ўпартая штодзённая работа. Толькі мэтадам сацспаборніцтва, пастаўленым нашай партыяй задачы ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва будуць з посьпехам выкананы.

Адозва XVI канфэрэнцыі УсеКП(б) была прынята тады, калі па пачыманьні ленінскага камсамолу ўступілі ў спаборніцтва яшчэ толькі дзесяткі фабрык і заводаў, калі толькі паасобныя фабрыкі і заводы, калгасы пачналі спаборніцтва. Да першай гадавіны няма НІ АДНЭЙ ФАБРЫКІ, НІ АДНАГО ЗАВОДУ, які б ня прымаў удзелу ў барацьбе [illegible] за будаўніцтва сацыялізму [illegible] нашым краі. І ня толькі фабрыкі і заводы ўступаюць у спаборніцтва. [illegible] кляса па закліку сваёй партыі, разгортваючы ў сябе на фабрыках і заводах камуністычныя мэтады работы, уцягнула найшырэйшыя бядняцка - сераднякіня масы сялянства ў спаборніцтва. Рабочая кляса паслала з свайго асяродку лепшых 25.000 пралетараў на работу па сацыялістычнай перабудове сельскае гаспадаркі, па выкарчоўваньні карэньняў капіталізму ў вёсцы, на ліквідацыю кулацтва, як клясы, на базе суцэльнае калектывізацыі.

За гэты год вылучаны дзесяткі тысяч лепшых рабочых - ударнікаў на работу ў дзяржапарат, тым самым яшчэ больш наблізіла яго да шырокіх рабочых мас.

Сацыялістычнае спаборніцтва ня толькі ахапіла пралетарыят і працоўных Савецкага Саюзу, яно шырока разгарнулася ў сусьветным маштабе. Рабочыя Саюзу ССР заключылі рад сацыялістычных дагавораў з пралетарамі капіталістычных краёў для сумеснай барацьбы супроць сусьветнага капіталу і яго служак — сацыял - фашыстых.

Рабочая кляса БССР, як частка пралетарыяту Савецкага Саюзу, не засталася ў апошніх радох. Пачыманьне ленінскага камсамолу было падхоплена шырокімі масамі рабочых.

Першымі ў БССР уступілі ў сацыялістычнае спаборніцтва рабочыя парыва прадпрыемстваў фабрыкі «ГЭРОЙ ПРАЦЫ» і мэталязаводу «ЧЫРВОНЫ МЭТАЛІСТЫ».

Гэта было яшчэ ў пачатку красавіка месяца 1929 году, а ў маі месяцы ўжо ўступілі ў спаборніцтва сотні фабрык і заводаў.

Сацыялістычнае спаборніцтва ахапіла ня толькі фабрыкі і заводы. Яно шырока разгарнулася ў саўгасах, калгасах, школах, больніцах, кааперацыі і г. д.

Калі ў пачатку былі асобныя групы ўдарнікаў, якія аб'ядналі толькі пачынальнікаў масавага спаборніцтва — ленінскіх камсамольцаў, дык да першай гадавіны мы маем ня толькі сотні тысяч ударнікаў, але і дзесяткі тысяч ударных фабрык, заводаў і цэхаў.

У БССР да першай гадавіны налічваецца (на 1-га сакавіка 1930 году) 209 ударных прадпрыемстваў з 32.839 рабочых, 761 ударны цэх — у іх 37.391 рабочы, 3.135 ударных брыгад, у іх удзельнічае 32.441 рабочы. Ударных вытворча - бытавых камун і калектываў мы маем 337, з колькасьцю рабочых 2.272 чал. і індывідуальных ударнікаў—10.514 чал. Гэтыя лічбы зьяўляюцца лепшымі сьведкамі адданасьці рабочае клясы справе будаўніцтва сацыялізму.

Пасьпяховае выкананьне плянаў сацыялістычнага будаўніцтва першага году пяцігодкі, бурны рост сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі, масавае ўступленьне батрацка - бядняцка-сераднякіх мас сялянства ў калгасы, рост прадукцыі ў першым паўгодзьдзі другога году пяцігодкі (толькі ў БССР, ня гледзячы на недавыкананьне кантрольных заданьняў прамысловасьцю, прадукцыя вырасла на 69,6 проц. у параўнаньні з першым паўгодзьдзем мінулага году) дашчэнту разьбівае нявер'е правых у сілы рабочае клясы, у нерэальнасьць пастаўленай задачы выкананьня пяцігодкі ў чатыры гады.

У пачатку разгортваньня масавага спаборніцтва ў цэлым радзе месц асобныя партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі не змаглі стаць на чале руху мас, вытворчыя нарады (гэта лепшая форма ўдзелу рабочых мас у вытворчым жыцьці прадпрыемства) ня ўсюды сталі апэрацыйнымі штабамі сацспаборніцтва.

Да першай гадавіны становішча значна палепшылася. Там, дзе сапраўды заводзкія арганізацыі, у першую чаргу прафсаюзныя, павярнуліся тварам да вытворчасьці, практычна кіруюць сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам ня толькі з посьпехам выконваецца, але і перавыконваецца прамфінплян.

Першую гадавіну разгорнутага сацыялістычнага спаборніцтва мы сустракаем шырокай самаправеркай стану сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Самаправерка павінна даць новыя сотні тысяч ударнікаў, павінна выявіць і зьнішчыць параднасьць у разгортваньні сацспаборніцтва, выявіць і выдаліць з радоў сапраўдных ударнікаў — ілжэ-ўдарнікаў, якія прыкрываючыся годнасьцю ўдарніка тармозяць пасьпяховасьць развіцьця ўдарніцкага руху, павінна выявіць і зьнішчыць спробы бюракратызацыі ўдарніцтва. Самаправерка павінна дапамагчы давесьці прамфінплян ня толькі да цэху, але і да рабочага месца, распрацаваць усюды кожнай ударнай брыгадзе і ўдарніку канкрэтныя заданьні, зьнішчыць безадказнасьць на вытворчасьці і дапамагчы поўнаму ажыцьцяўленьню адзінаначальля. Самаправерка асабліва павінна дапамагчы наладзіць рацыяналізацыю вытворчасьці, як важнейшага сродку ў справе пасьпяховага выкананьня прамфінплянаў.

Уступаючы ў другі год сацыялістычнага спаборніцтва, мы яшчэ з большай сілай будзем дабівацца на аснове вытворчага ўздыму рабочае клясы разьвіцьця вынікаў у выкананьні і перавыкананьні прамфінпляну, у ажыцьцяўленьні пяцігодкі ў чатыры гады.

У бязьлітаснай барацьбе з правым апартунізмам — галоўнай небясьпекай і з «левымі» загібамі за ленінскую лінію партыя вядзе пралетарыят і бядняцка - сераднякіня масы сялянства па шляху да сацыялізму.

Апэрацыйная зводка з гаспадарчага фронту

ВЫНІКІ ДВУХ ДЭКАД

У статыстычным аддзеле ВСНГ нашаму супрацоўніку паведамілі аб выкананьні прамфінпляну за першыя ДЗЬВЕ ДЭКАДЫ КРАСАВІКА асобнымі прадпрыемствамі.

Па шкляной прамысловасьці завод «ПРАЦА»—за 20 дзён красавіка выканаў—61,7 проц. месячнага заданьня. Завод «ДОМБАЛЬ»—69,5 проц. заданьня.

Па мэталя-апрацоўчай прамысловасьці завод «ЧЫРВОНЫ АДРАДЖЭНЕЦ»—за 20 дзён красавіка выканаў 117,2 проц. месячнага заданьня, завод «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК»—105,4 проц., завод «КАМУНАР»—64,2 проц. і «ПРАЛЕТАРЫ»—58,7 проц.

Па тэкстыльнай прамысловасьці фабрыка «ДНЯПРОЎСКАЯ МАНУФАКТУРА» ў першыя дзьве дэкады красавіка выканала 62,9 проц. месячнага заданьня, «ЯКАЎЛЕВІЦКАЯ МАНУФАКТУРА» — 55 проц.

Па хэмічнай прамысловасьці фабрыка «Х-ты КАСТРЫЧНІК» за першыя дзьве дэкады выканала—69,9 проц. месячнага заданьня, «ВЕЗУВИЙ»—66,5 проц. фабрыка «Днепр»—55,1.

Па дрэваапрацоўчай прамысловасьці фанэрны завод «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК»—за 20 дзён выканаў 119,6 проц. месячнага заданьня, завод ІМЯ ХАЛТУРЫНА—103,8 проц. «КАМІНТЭРН»—95,9 проц., «СПАРТАК»—73,3, «САЦЫЯЛІЗМ»—81 проц., «АДРАДЖЭНЬНЕ»—90,1 проц.

Па іншых прадпрыемствах весткі за другую дэкаду красавіка ў ВСНГ пакуль што не атрыманы.

4-га мая г. г. а 6 гадз. увечары склікаецца

Аб'яднаны пленум Мен. АК і АКК КП(б)Б.

З ПАРАДКАМ ДНЯ

1. Справаздача АК КП(б)Б (т. СЛАВІНСКІ).
2. Аб далейшых задачах у галіне калектывізацыі сельскай гаспадаркі (т. ТАМАШЭЎСКІ).
3. Вынікі чысткі партарганізацыі т. (ДАМБРОЎСКІ).
4. Пытаньні VIII-ай партканфэрэнцыі.

Сакратар Мен. АК КП(б)Б СЛАВІНСКІ.

Прафсаюзы падагульваюць вынікі сацспаборніцтва

(Анкета „Зьвязды“)

За ўдарныя цэхі і заводы!

Бязьлітасна выкрываць ілжэ-ўдарнікаў

(Гутарка з членам прэзыдыуму ЦП саюзу дрэваапрацоўшчыкаў т. Рагінскай)

Большасьць членаў прэзыдыуму ЦП нашага саюзу знаходзіцца зараз на месцах і прымае ўдзел у праверцы сацыялістычнага спаборніцтва на прадпрыемствах. Весткі якія паступаюць ад гэтых таварышоў, паказваюць, што сацыялістычныя дагаворы ў асноўным выконваюцца. У спаборніцтва ўцягнута пераважная частка рабочых. На радзе заводаў ва ўдарных брыгадах знаходзіцца ўсе 100 проц. рабочых.

Наступныя прадпрыемствы зьяўляюцца пункцыю ўдарнымі: завод «Дрэваапрацоўшчык», завод «Камінтэрн» (Барысаў), фанэрная ф-ка імя Томскага (Бабруйск), лесазавод № 13 (Віцебск), ф-ка «Сацыялізм» (Гомель) і інш.

Большасьць цэхаў Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату таксама абвясьціла сябе ўдарным. Аднак, у сувязі з прыёмам многіх новых рабочых, тут патрэбна асабліва ўважлівая і сыстэматычная растлумачальная работа аб значэньні сацспаборніцтва. На камбінаце ўжо звыш месяца знаходзяцца два прад стаўнікі ЦП саюзу, якія праводзяць работу па праверцы спаборніцтва. Прамфінплян даведзены да кожнага цэху і агрэгату. За апошні час камбінат дае здавальняючыя вынікі ў адносінах выкананьня прамфінпляну.

Дрэнная справа і на галянтарэйнай фабрыцы «Беларуска» (Менск). Ня гледзячы на тое, што тут 80 проц. рабочых зьяўляюцца ўдарнікамі, вытворчая праграма ня выконвалася. Дырэктар фабрыкі зусім нічула і няўважліва адносіўся да прапаноў рабочых і ня прымаў мер для разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва.

Зараз становішча паляпшаецца. Дырэктар фабрыкі зьнят з працы. Праверка сацыялістычнага спаборніцтва на фабрыцы скончылася. 30 красавіка адбудзецца вытворчы вечар рабочых, на якім будуць падведзены вынікі праверкі. Фабрычныя арганізацыі павінны прыняць усе меры, каб выканаць узятыя на сябе абавязкі.

Зусім слаба спраўляецца са сваімі задачамі Віцебскі фанэрны завод № 8. Тут прамфінплян за першае паўгодзьдзе значна недавыкананы. Сацыялістычнае спаборніцтва не ахапіла шырокіх мас рабочых.

На менскім заводзе «Дрэваапрацоўшчык» ва ўдарныя брыгады ўцягнута большая частка рабочых, але прамфінплян заводу за першае паўгодзьдзе недавыкананы. Як вытворчая праграма, так і заданьне на зьніжэньні сабекошту прадукцыі засталіся нявыкананымі. Пры складаньні прамфінпляну разлічвалі, што завод будзе працаваць у дзьве зьмены, але да гэтага часу ён працуе ў адну зьмену. Таму вытворчая праграма нявыканана.

Ударніца за варштатам.

Сац. дагаворы ў асноўным выконваюцца

Гута „Камінтэрн“ атрымала прэмію

(Гутарка з намесьнікам старшыні саюзу хэмікаў т. Новікавым)

Па ўсіх прадпрыемствах, якіх яднае саюз хэмікаў, сацыялістычнае спаборніцтва разгорнута поўным тэмпам. Самаправерка сацспаборніцтва, якая зараз праводзіцца, паказвае, што ў асноўным дагаворы сацыялістычнага спаборніцтва выконваюцца як з боку рабочых, так і з боку адміністрацыі.

У сацыялістычнае спаборніцтва ўцягнуты шырокія масы рабочых. Дзьве гуты—імя Домбаля і «Ноўка» — зьяўляюцца поўнасьцю ўдарнымі. Праўда, на гуце «Ноўка» выкананьне прамфінпляну да гэтага часу ішла зусім нездавальняюча. Аднак, за апошні месяц першага паўгодзьдзя «Ноўка» значна падцягнулася. Гута імя Домбаля за першае паўгодзьдзе выканала поўнасьцю сваю вытворчую праграму.

Ёсьць асобныя выпадкі ілжэ-ўдарніцтва. Так, на гуце імя Домбаля запісаліся ва ўдарнікі рабочыя Міхайлаў і Бабіцкі, якія аказаліся рвачамі і шкурнікамі. Калі аднойчы загарэўся варштат, дык яны сталі з боку і спакойна пакурвалі, зусім ня зьбіраючыся тушыць пажару. Агульны сход рабочых пастанавіў зьняць з работы абодвух і выключыць іх з членаў прафсаюзу.

Слаба разгорнута ўдарніцтва на запалкавых фабрыках «Дняпро» і «Х Кастрычнік» (Рэчыца). Там з агульнай колькасьці рабочых 2.788 чал. ва ўдарных брыгадах знаходзіцца толькі 1.136 чал., што складае 40 проц.

На фабрыцы «Чырвоная Бярэзіна» ўцягнута ва ўдарныя брыгады 75 проц. рабочых. На фабрыцы раней былі асобныя прарывы ў выкананьні прамфінпляну. Але за апошнія месяцы, у сувязі з самаправеркай сацспаборніцтва, «Чырвоная Бярэзіна» падцягнулася. ЦП саюзу камандыравала на фабрыку члена прэзыдыуму ЦП т. Кудраева для правядзеньня праверкі спаборніцтва.

Добра спраўляюцца з узятымі на сябе абавязкамі рабочыя гуты «Камінтэрн» (Бабруйск). Завод—ударны, усе 100% рабочых зацікаўлены прамфінплянам і прыкладаюць усе сілы, каб выканаць яго. Гута ўвесь час ідзе ўперадзе. Нядаўна ВСНГБ прымяваў гуту за добрае выкананьне прамфінпляну на 10.000 р.

Вельмі слаба выконвае прамфінплян гута «Кастрычнік» (Бабруйшчына). За першае паўгодзьдзе гута зьнізіла сабекошт прадукцыі на 6,9 проц. замест 13,6 проц., вызначаных плянам.

ЦП саюзу на бліжэйшым пленуме заслухае даклад аб ходзе самаправеркі сацыялістычнага спаборніцтва на прадпрыемствах. Зараз амаль усе члены прэзыдыуму ЦП знаходзяцца ў акругах на прадпрыемствах, дзе дапамагаюць заводзкім арганізацыям у правядзеньні праверкі.

Вынікі спаборніцтва —невядомы

(Гутарка з старшынёю Белкамітэту працаўнікоў паперы т. Гнілякевічам)

Якія вынікі сацыялістычнага спаборніцтва будуць на фабрыках папяровай прамысловасьці яшчэ невядома. У самаправерцы на фабрыцы «Гэрой Працы» прымаюць удзел 250 чал. рабочых і 15 спэцыялістых. Зусім нездавальняючы ўдзел у самаправерцы прымала моладзь. Вытворчы цэх не хацеў прымаць ніякага ўдзелу толькі таму, што паасобныя кіраўнікі цэху гаварылі: «навошта праверацаць, нядаўна-ж правяралі, як даведзены прамфінплян да цэху».

Ударніцтвам на фабрыцы дрэнна кіравалі. Таму ёсьць шмат ударнікаў, якія не апраўдваюць сваёй назвы. Ня гледзячы на тое, што фабрыка зьяўляецца ўдарнай, прагулы, п'янства, сон у часе працы зьяўляюцца звычайным зьявішчам у жыцьці фабрыкі. Адміністрацыя не інфармавала фабкому аб выкананьні сацдагавору. Цэхпрафбюро не зьяўляецца сапраўдным кіраўніком у цэху.

Фабрыка «Спартак» паслала брыгаду з 3-х чалавек на фабрыку «Чырвоная Зорка» для правядзеньня самаправеркі. Замест таго, каб дапамагчы заверабаць добраахвотнікаў, брыгада п'янствавала, а фабком і партыйна-камсамольскія арганізацыі ніякага ўдзелу ня прымалі ў праверцы, ня было ні аднаго добраахвотніка. АПВ трэба было прыслаць свайго прадстаўніка на фабрыку «Чырвоная Зьвязда», але гэта яшчэ дасюль ня зроблена. На фабрыцы хаос, сакратар парт'ячэйкі займаецца адміністраваньнем. Белпапертрэст прыслаў тэлеграму аб тым, каб з 1-га красавіка выбраляць шпалерную паперу. Дырэктар, замест выкананьня загаду трэсту, запытаў у сакратара парт'ячэйкі, што зрабіць з тэлеграмай!

— Ня трэба выконваць—адказаў сакратар. І дырэктар згадзіўся.

З прычыны адсутнасьці шпалернай паперы 9 дзён была прымушана стаяць шпалерная фабрыка імя Бароўскага. На «Чырвонай Зьвязьдзе» кавалерыйскім галопам і бяз удзелу мас праверка ўжо скончана. Фабрычныя арганізацыі «почили на лаврах».

Такая праверка ня можа даць ніякай карысьці.

Адміністрацыя ня выконвае сацдагавораў

Рабочыя друкарні БДВ выкрываюць ілжэ-ўдарнікаў

(Гутарка са старшынёй ЦП саюзу друкароў т. Левіным)

Па друкарні БДВ ўжо скончана праверка сацыялістычнага спаборніцтва. Праверка паказала, што сярод ударнікаў ёсьць асобныя рабочыя, якія запісаліся ўдарнікамі толькі для фармальнасьці. На справе-ж гэтыя рабочыя ня толькі не паказваюць ударных тэмпаў работы, а наадварот, праяўляюць сябе, як рвачы і скурнікі. У друкарні БДВ быў выпадак, калі адзін «ударнік» быў ганебна выведзен з ударнай брыгады і занесен на чорную дошку, як рвач і скурнік.

Ёсьць асобныя выпадкі недысцыплінаванасьці з боку рабочых, няўважлівых адносін да варштатаў, дарэмнага марнаваньня рабочага часу і г. д. Наглядзецца таксама і невыкананьне сацыялістычнага дагавору з боку адміністрацыі. Так, ня ўведзен вучот браку, недастаткова рацыянальна выкарыстоўваецца рабочая сіла, ня вывешваюцца паказальнікі выкананьня прамфінпляну па цэхах, цэхі і аддзяленьні невыстарчальна забясьпечваюцца патрэбнымі матар'яламі і г. д.

Сацыялістычным спаборніцтвам ахоплены ўсе 100 проц. рабочых друкарні БДВ. Друкарня спаборнічае з гомельскай друкарняй «Палесдрук». Апошняя таксама поўнасьцю ўдарная. Аднак, за першае паўгодзьдзе «Палесдрук» ня выканаў поўнасьцю сваёй вытворчай праграмы. Заданьне выканана толькі на 92 проц. Праўда, у сакавіку заданьне выканана на 113 проц., але агульны прарыў за мінулыя месяцы гэтым не пакрыты. Зьніжэньне сабекошту прадукцыі складае 24,6 проц. за першае паўгодзьдзе. Між тым, паводле пляну, «Палесдрук» павінен быў зьнізіць сабекошт на 28,8 проц.

Нявыкананы дырэктывы аб правядзеньні адзінаначальля. У друкарні «Палесдрук» зусім не адчуваецца адказнасьці цэхавай адміністрацыі за сваю работу.

Добра праходзіць спаборніцтва на шпалернай фабрыцы (Менск). За першае паўгодзьдзе ў выніку шырокага ўцягненьня рабочых ва ўдарныя брыгады, прамфінплян перавыкананы. Вытворчая праграма за першае паўгодзьдзе выканана на 103 проц. Сабекошт прадукцыі зьніжаны на 16 проц. замест 10,9 проц., вызначаных плянам. Прадукцыйнасьць працы зьвышана на 44,5 проц. замест 42,6 проц., вызначаных плянам.

Бабруйская друкарня таксама добра спраўляецца са сваімі абавязкамі. Плян за першае паўгодзьдзе выканан на 112 проц. Прадукцыйнасьць працы зьвышана на 22 проц.

Зараз на ўсіх прадпрыемствах, якія яднаюцца саюзам друкароў, праводзіцца самаправерка сацыялістычнага спаборніцтва. У праверцы прымае ўдзел прадстаўнік ЦК саюзу друкароў. Па 1-й друкарні, «Палесдруку» і віцебскай друкарні праверку праводзяць 12 брыгад у ліку 170 чал., што складае 16 проц. усёй колькасьці рабочых, занятых на паказаных прадпрыемствах.

Лепшы ўдарнік

Загатоўшчык абутковай фабрыкі т. Годэр. Вытворчы стаж 42 гады. Звычайная норма загатовак—165 шт. у дзень. Выпрацоўвае 220 пар.

Упередадзе фабрыка „Кастрычнік“

(Гутарка з старшынёю Белкамітэту швейнікаў т. Майзапевай)

На швейнай прамысловасьці сацыялістычныя дагаворы ў асноўным выконваюцца. На фабрыцы «Кастрычнік» (Менск) з 1.700 рабочых 1.600 зьяўляюцца ўдарнікамі. Шырока разгорнута работа па праверцы сацспаборніцтва і прамфінпляну, запісалася 100 чал. добраахвотнікаў.

На швейнай фабрыцы «Камінтэрн» (Гомель) самаправерка скончана. З 700 рабочых прымала ўдзел 130 добраахвотнікаў. Фабрыка цалкам абвясьціла сябе ўдарнай.

У «Камінтэрне» прадукцыйнасьць працы ў параўнаньні з мінулым годам павялічылася на 35 проц., сабекошт прадукцыі зьніжаны на 8 проц.

Фабрыка «Прафінтэрн», на якой занята 3.000 рабочых, ня выконвае сацыялістычнага дагавору па зьмяншэньні браку і пераробак.

Узмоцнім барацьбу з прагуламі, прастоямі, бракам! Прывітаньне перадавіком сацыялістычнага спаборніцтва, гэроям камуністычнай працы—ударнікам савецкай індустрыі!

Прафсаюзы—бліжэй да мас, цэхаў і брыгад! Больш клапатлівасьці аб павышэньні прадукцыйнасьці працы і рэальнай заработнай платы! Тварам да вытворчасьці!

АСНОЎНЫ МАТАР'ЯЛ АБ ГАДАВІНЕ САЦСПАБОРНІЦТВА БУДЗЕ ЗЬМЕШЧАНЫ Ў НАСТУПНЫМ ПЕРШАМАЙСКІМ НУМАРЫ «ЗЬВЯЗДЫ».

За сацспаборніцтва, за прамфінплян

Апошні Пленум Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б у пачатку красавіка падвёў вынікі работы прамысловасьці за 5 месяцаў 29-30 г. За гэты час валавая прадукцыя павялічылася на 69,6 проц., колькасьць рабочых — на 26 проц., а прадукцыйнасьць працы — на 33,9 проц. (у параўнаньні з адпаведнымі пэрыядамі мінулага году). Па галінах прамысловасьці наглядаецца яшчэ большы ўзрост вытворчасьці: мэталёвая — 58,6 проц., шкляная — 116,2 процанты, панчошна - трыкатажная — 164 проц., скурана - абутковая 90,5 процантаў і інш.

Гэтыя лічбы сьведчаць аб рэальнасьці нашага пяцігодовага пляну і аб магчымасьці выкананьня намі ўзятых тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, сьведчаць аб вялікіх дасягненьнях рабочае клясы на гаспадарчым фронце.

Аднак, Пленум Цэнтральнага Камітэту адзначыў, што **дасягнутыя вынікі зьяўляюцца недастатковымі, бо прамфінплян недавыканан на 5,8 проц. (па валавой прадукцыі).**

Сакавік даў значны пералом

Сакавік характарызуецца арганізацыяй шырокай барацьбы за выкананьне прамфінпляну, мабілізацыяй вакол гэтага пытаньня рабочай грамадзкасьці і дае, у параўнаньні з іншымі м-цамі, **значны пералом** (прырост валавой прадукцыі на 14,8 проц., вытворчая праграма выканала на 100,7 проц.

Усё-ж, нягледзячы на палепшаньне работы ў сакавіку, рад галін прамысловасьці яшчэ адстаюць: мэталёвая, дрэваапрацоўчая, баваўняна - палярова, скурана - абутковая, запалкавая; плян за першае паўгодзьдзе выканан толькі на 94.2 проц.

Прамысловасьць не порабудавала сваёй працы

Асноўныя прычыны невыкананьня прамфінпляну тлумачацца не аб'ектыўнымі ўмовамі, а тым, што **прамысловасьць не порабудавала сваіх мэтадаў работы, а прафсаюзы не мабілізавалі з першага-ж дня новага гаспадарчага году ўвагі рабочых мас вакол выкананьня прамфінпляну.**

Нягледзячы на дырэктывы, **прамфінплян свячасова ня быў даведзен да асобных прадпрыемстваў, цэхаў і рабочых.** Па асобных прадпрыемствах ёсьць выпадкі, калі рабочыя ня ведаюць сваіх заданьняў. На большасьці прадпрыемстваў дрэнна пастаўлена работа ТНБ, рацыяналізатарскіх бюро. Дырэктыва ЦК аб правядзеньні адзінаначальля, якое павінна палепшыць кіраваньне прадпрыемствамі, праводзіцца недастаткова рашуча. Шмат лепшага можна яшчэ жадаць у адносінах узмацненьня працоўнай дысцыпліны, арганізацыі працы.

Недастатковая ўвага пытаньню падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых кадраў, слабае кіраўніцтва пераводам прадпрыемстваў на бесьперапынны рабочы тыдзень і 7-гадзінны рабочы дзень і рад інш. важных момантаў — вось прычыны недавыкананьня пляну за першае паўгодзьдзе і прарываў за гэты час.

Давесьці прамфінплян да кожнага варштату

Пленум Цэнтральнага Камітэту даў выразныя і рашучыя дырэктывы ў галіне выкананьня прамфінпляну 29-30 г. Галоўныя з іх: **давядзеньне прамфінпляну да кожнага прадпрыемства, цэху і варштату.** Кожны рабочы павінен ведаць аб сваіх заданьнях. Канчатковы тэрмін ажыцьцяўленьня гэтай дырэктывы **пасьпешнае чэрвеня.**

Па пытаньні аб адзінаначальлі патрабуецца яшчэ значная растлумачальная работа сярод рабочых заводаў і канкрэтнае разьмеркаваньне абавязкаў паміж адміністрацыяй і рознымі арганізацыямі на прадпрыемствах. Даволі ясна гэтая дырэктыва пацьверджана рашэньнем ЦК УсеКП(б) за 10 красавіка.

Пастанова ЦК КП(б)Б і СНК аб скарачэньні рэарганізацыі прамысловасьці БССР да 15 красавіка г. г. яшчэ ня выканана цалкам, галоўным чынам, ня скончана рэарганізацыя на самых прадпрыемствах.

Тэрміны могуць быць працягнуты да 15 мая, але гэта ўжо апошні тэрмін, пасьля якога ня можа застацца ні адно аб'яднаньне і прадпрыемства, якое працуе па-старынцы, не прыстасавала сваёй працы да новых складаных умоў і задач рэканструкцыйнага пэрыяду.

Неабходна палепшыць кіраўніцтва пераводам прадпрыемстваў на бесьперапынны тыдзень і 7-гадзінны рабочы дзень, належным чынам праводзячы падрыхтоўчую работу.

Узмацніць падрыхтоўку кадраў

Трэба ўзмацніць тэмпы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў — кіраўчых, тэхнічных і рабочых. Тут з боку ВСНГ БССР і ўсіх арганізацый патрабуецца максымум увагі і клапатлівасьці, трэба арганізаваць ВТНУ і аднагадовыя курсы каманднага складу прамысловасьці (камплектаваньне за лік рабочых, падрыхтоўка пэдагагічнага складу навучальных плянаў, наладжваньне фінансавай і гаспадарчай справы).

Акрамя гэтага, патрабуюцца даволі канкрэтныя мерапрыемствы па вылучэньні рабочых на кіруючыя пасады, па падвышэньні кваліфікацыі гаспадарнікаў, каб яны сапраўды змаглі-б тэхнічна кіраваць прамысловасьцю (арганізацыя кароткa - тэрміновых курсаў, пасылка ў навуковыя экскурсіі, забясьпячэньне тэхнічнай літаратурай і інш.).

Пашырэньне сеткі ФЗВ, адкрыцьцё курсаў, гурткоў на прадпрыемствах, для падрыхтоўкі кваліфікаванай рабочай сілы — усё гэта павінна зьмякчыць голад у кадрах.

Будаўнічы сэзон ужо пачаўся, але-ж становішча раду пабудоў сыгналізуе нам аб небясьпецы на гэтым вучастку. Забясьпечаньне будаўніцтва матар'яламі, праектамі, кваліфікаванай рабсілай і тэхнэрсаналам, палепшаньне якасьці і патаньне сабекошту будаўніцтва, разгортваньне масавай работы на пабудовах — гэта грунтоўнае, што патрабуецца для бягучага будаўнічага сэзону. Ад пасьпяховага правядзеньня будаўнічага сэзону ў значнай меры будзе залежаць выкананьне кантрольных лічбаў трэцяга году пяцігодкі.

Зразумела, што ўсе гэтыя задачы **могуць быць выкананы толькі пры ўмове разгортваньня ініцыятывы, шырокага скарыстаньня вялізарнай актыўнасьці рабочых мас, разгорнутага сацспаборніцтва і ўдарніцтва.**

Сацспаборніцтва дало вялікія вынікі

Сацыялістычнае спаборніцтва дало рад гэраічных прыкладаў барацьбы на гаспадарчым фронце. Яно закрануло ўсе галіны нашай народнай гаспадаркі. Сацспаборніцтва паказала рад яркіх прыкладаў творчага энтузіязму мас, аддаласьці генэральнай лініі партыі і зрабіла тое, што на працягу паўгодзьдзя прамысловасьць дабілася рашучых вынікаў, як у колькасных, так і ў якасных паказальніках. Цэлыя заводы абвясьцілі сябе ўдарнымі, камуністычнымі і даказваюць, што яны вартыя гэтай годнасьці.

Магілеўская гарбарня імя Лекерта перавыканала вытворчую праграму на 6 проц.; прадукцыйнасьць працы зьвынята на 6 проц. супроць пляну.

Рабочыя гуты «Камінтэрн» (Бабр. акр.) выканалі вытворчую праграму на 116 проц. Сабекошт замест 7.4 проц. зьніжаны да 10,77 проц., прадукцыйнасьць працы замест 13 проц. узьнята на 20 проц.; брак і бой зьніжаны з 8,8 проц. да 3,8 проц.

Работніца шліфавальнага цэху **Авакумава** абвяшчае сябе ўдарніцай, добраахвотна зьніжае расцэнку па ўпакоўцы круглага акуляравага шкла на 10 проц. і інш. (акулярная ф-ка).

Перашкоды на шляху сацспаборніцтва

Аднак, на шляху сацыялістычнага спаборніцтва сустракаецца і шмат перашкод, а іменна: **зусім слабы ўдзел інжынэрна - тэхнічнага пэрсаналу ў спаборніцтве, невыстарчальная дапамога адміністрацыйнага пэрсаналу.**

Рад рацыяналізатарскіх і вынаходніцкіх мерапрыемстваў не выкарыстоўваецца. Прафсаюзныя арганізацыі слаба кіруюць ударнымі брыгадамі. Вось характэрны прыклад: першыя ўдарныя брыгады на Бабруйскім камбінаце былі арганізаваны ў студзені месяцы, між тым, парадзе старэйшых брыгадзіраў была склікана толькі ў сакавіку. На дрэ

Падрабязнасьці замаху на савецкае паўпрэдзтва ў Варшаве

У арганізацыі замаху прымала ўдзел цэлая арганізацыя

Выбух пагражаў зьнішчэньнем усёй савецкай калёніі ў Варшаве з сем'ямі і дзецьмі

ВАРШАВА, 27. Няма ніякага сумненьня, што ў арганізацыі замаху на савецкае поўнамоцнае прадстаўніцтва прымала ўдзел цэлая арганізацыя. Ужо папярэднае дасьледваньне «пякельнае» машыны даводзіць, што яна зроблена паводле апошняга слова тэхнікі. Абстаяваньне «пякельнай» машыны выключае ўсякія меркаваньні, што яна магла быць зроблена і, тым больш, установлена адной ці нават дзьвюма асобамі. Экспэртыза «пякельнай» машыны яшчэ ня скончана, але ўжо папярэднія даныя ясна сьведчаць аб надзвычайнай разбуральнай сіле знараду. Знарад, які мае 70 сантымэтраў у даўжыню і 18—у дыяметры важыць 30 кілё, нападаваны машынаю моцных выбуховых матэрый. Паводле заявы друку, знарад меў такую сілу, што разбурыў-бы ня толькі будынак поўпрэдзтва, але ўцярпелі-б і суседнія дамы. Па механізьме гадзіньніка ўстаноўлена, што знарад павінен быў выбухнуць паміж 8 і 9 гадз. увечары. Трэба падкрэсьліць, што ў гэты час, як звычайна па суботах, у памяшканьні клюбу ў доме поўпрэдзтва павінен быў адбыцца кіно-сэанс для членаў савецкай калёніі ў Варшаве. Таму выпадкова папярэджаны выбух ПАХАВАЎ-БЫ ПАД РУІНАМІ БУДЫНКУ ПОЎПРЭДЗТВА УСЮ САВЕЦКУЮ КАЛЁНІЮ Ў ВАРШАВЕ З СЕМ'ЯМІ І ДЗЕЦЬМІ. Зусім выдавочна, што ўся падрыхтоўка выбуху адбывалася ў суседнім з пасольскім доме, на Пазнанскай вуліцы, 17.

Тэхнічная ўстаноўка «пякельнай» машыны заняла шмат часу. Паводле паказаньняў аднаго з жыхароў дому, яшчэ 17 красавіка ён заўважыў нейкія махінацыі з электрычнай лямпачкай на сходах, пад якімі, як цяпер устаноўлена, ішоў электрычны провад да «пякельнай» машыны.

Кватарантка дому паведамляе, што задоўга да 29 красавіка, яна заўважыла трох мужчын на даху дому, але не зьвярнула на гэта ўвагі, думаючы, што яны ўстанаўляюць антэну. Да гэтага часу застаецца таямніцай, як МАГЛІ Ў ПРАЦЯГУ МНОГІХ ДЗЁН БЕЗ ПЕРАШКОД ПРАЦАВАЦЬ НА ВЫШЦЫ І ДАХУ ДОМА НЕВЯДОМЫЯ ЛЮДЗІ, ЯКІ ЗНАХОДЗІЦЦА Ў НЕПАСРЭДНЫМ СУСЕДСТВЕ З ПАЛІЦЭЙСКІМ ВУЧАСТКАМ. Узьнікае натуральная падазронасьць, што арганізатары выбуху мелі апорны пункт у доме 17, інакш яны не маглі-б вольна апэраваць там.

Афіцыёзная «Іскра» спасылаючыся на заявы аўтарытэтных крыніц, паведамляе: «У даны момант цяжка яшчэ рабіць канкрэтныя меркаваньні адносна далейшага сьледзтва». Ва ўсякім выпадку яна сур'ёзна падазрае, што «замахі, які на шчасьце няўдаўся, зьяўляюцца справай расійскіх эміграцкіх сфэр, якія вельмі часта злоўжываюць правам прытулку».

Газэты паведамляюць, што паліцыяй зроблены масавыя вобыскі сярод эміграцкіх арганізацый ня толькі ў Варшаве, але і ў правінцыі.

Паведамленьне аб замаху на савецкае поўпрэдзтва пашырылася ўчора з хуткасьцю маланкі і зрабіла вялікае ўражаньне ў варшаўскіх палітычных колах, і сярод чужаземных журналістых. Друк пакуль надзвычай стрыманы і ўнікае камэнтаваць факт. «Работнік» заяўляе, што, дзякуючы шчасьліваму злучэньню акалічнасьцяй, Варшава ўнікла вялікай катастрофы, вынікі якой цяжка ў даны момант нават прадбачыць. Сьледзтва працягваецца. Сёньня былі зацілёва абсьледаваны паліцыяй вышкі і дахі суседніх з паўпрэдзтвам дамоў.

Бульварная польская прэса імкнецца выкарыстаць замах для чарговай антысавецкай кампаніі

ВАРШАВА, 27. «Кур'ер Паранны» і да яго падобныя бульварныя газэты ўжо цяпер прабуюць скарыстаць у сваіх мэтах замах на поўпрэдзтва, як гэта было пасьля забойства тав. Войкава, калі «Кур'ер Паранны» абвінавачваў у падрыхтоўцы забойства само савецкае поўпрэдзтва. Цяпер «Экспрэс Паранны» заяўляе аб магчымасьці арганізацыі апошняга замаху «прыхільнікамі савецкай апазыцыі». Для «Кур'ера Паранага» учарашнія замах зьяўляецца фантастычнымі чуткамі, прычым газэта называе «пякельную» машыну «таямнічай скрынчкай».

НАЧНОЕ РАДЫЁ

ЗАЦІРАЮЦЬ СЬЛЯДЫ

Наглыя правакацыйныя выступленьні польскага друку

ВАРШАВА, 28. Увесь польскі друк старацца замазаць справу ўдзтаванага Ўрэду савецкага прадстаўніцтва ў Варшаве. Друк паведамляе, што ў снарадзе вагою 30 кілё аказалася ўсяго 6 кілё чорнага пораху, а загатым і сіла ўзрыву была-б шмат меншай, як гэта думалі раней, спарад-бы разбурыў усяго толькі адну сьцяну, а ў горшым выпадку — кватэру паўпрэда. «Газэта Польская» (афіцыёз) заяўляе: «замах меў толькі дэманстрацыйны характар». Орган нізсудчыкаў «Кур'ер Паранны» выдумляе «аб інтэнсіўнае замаху на карысьць камуністых». «Кур'ер Поляценны» таксама паныхрдзае гэту версію і выказвае думкі, што замах быў зроблен на цыркуляру Камінтэрну з мэтай выклікаць абурэньня мас у дзень 1-га мая». Такім чынам, маем адзіны фронт усяго ўрадавага друку.

ВАРШАВА, 28. Уся польская праса шалёна павяла наступленьне на заяву аб тым, што замах быў арганізаваны белаэмігрантамі. Газэты проста заяўляюць, што гэта «справа рук камінтэрну», как камуністычным агітатарам у дзень 1-га мая мець базу для сваіх антыдзяржаўных выступленьняў. Газэты пацьвярджаюць гэта нібыта тым, што вобыскі у белаэмігрантаў ня далі ніякіх вынікаў, тады як у час вобыскаў у камуністых, нібыта у аднаго з камуністых знойдзена невялікая колькасьць пораху.

ЦКАВАНЬНЕ ПАЎПРЭДЗТВА

ВАРШАВА, 28. Паўшыя колы прывялі ў рух апарата друку увесь свой агітацыйны апарат, каб стварыць вакол паўпрэдзтва СССР ў Варшаве зусім немагчымую атмасфэру. Апошнія два дні гэты апарат працуе без перадышкі пробуючы пераканаць грамадзкасьць у тым, што замах зьяўляецца «правакацыяй, якая арганізавана самім насольствам».

Хваля абурэньня ахапіла пралетарскі Менск

Рабочыя заводу «Энэргія» сабраліся на мітынг пратэсту супраць правакацыі польскіх фашыстых глыбока абурае рабочых. Выступленьні карэтніка, бурныя, гнеўныя.

Рабочыя катэгарычна патрабуюць ад Савецкага Ўраду прыняць рашучыя меры да аховы нашых прадстаўнікоў у Польшчы ад замахаў азьвярэлых фашыстых, якія не спыняюцца ні перад чым, каб толькі сарваць правакацыю э мэтай сарваць нармальнае сацыялістычнае будаўніцтва.

Рабочыя заводу «Энэргія» вельмі ўважліва сочаць за сваім неспакойным суседзям і заўседы гатовы даць належную спробе польскіх фашыстых перайсьці мяжу Савецкага Саюзу.

* * *

Агульны сход рабочых і служачых мясцкому № 2 тэрнай чыгуркі пры пракляцьце міжнародная буржуазіі, якая жадае ўсімі спробамі ўцягнуць Савецкі Саюз у кампанію, каб пакончыць з нашай ваўтаю.

На спробу буржуазіі ўсталяваньне ды толькі выманаваньнем прамфінпляну.

Усе, як адзін у баявы атрад працоўных нашага фронту на ня ў чатыры гады!

Мы, рабочыя Менскай абутковай фабрыкі, заяўляем, што ў адказ на палітыку польскага фашызму ўцягнуць нас у вайну, мы адкажам яшчэ большым згуртаваньнем сваіх радоў наўкола Камуністычнай партыі, яшчэ большым напружаньнем сваёй энэргіі на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, яшчэ большым разгортваньнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва для выкананьня пяцігодкі ў чатыры гады.

Мы заяўляем, што па першым заклику Камуністычнай партыі і савецкага Ўраду ўсе, як адзін, станем на абарону граніц Савецкага Саюзу.

Мы патрабуем ад савецкага ўраду ужыць самыя рашучыя меры для поўнага забесьпячэньня нармальнай бесьперабойнай работы нашых прадстаўніцтв заграніцай.

Акрамя таго, рэвалюцыі пратэсту в прычыны чудовішчнага замаху на савецкае поўнамоцнае прадстаўніцтва ў Варшаве атрыманы яшчэ ад рабочых і служачых заводу «Чырвоны Золак», ад калектыву супрацоўнікаў Менскага аддзяленьня Белкаапсаюзу, ад курсантаў і начальніцкага складу палкавой школы №-скага стралковага палка, ад агульнага сходу студэнтаў, выкладчыкаў і слухачоў Менскага Белпэдтэхнікуму, аднагадовых пэдкурсаў і курсаў сельгаспрацоўнікаў па падрыхтоўцы ў ВНУ і г. д. і г. д.

Рэвалюцыі паступаюць у рэдакцыю бязупынна.

Урачыстае адкрыцьцё Турксібу

РЭЛЬСАВАЯ ЗМЫЧКА ТУРКСІБУ

АЙНА-БУЛАК, 28. Сёньня, а 9 гадз. раніцы, ля станцыі Айна-Булак адбылося адкрыцьцё руху Турксібу. Месца змычкі Турксібу запружана тамі рабочых, казакамі з разгорнутымі вялізарнымі натоўкаў і коннымі атрадамі сьцягамі.

На трыбуну падыходзяць прадстаўнікі ўраду, партыйных, прафэсіяльных і грамадзкіх арганізацый. На трыбуне знаходзяцца чужаземцаў знаходзяцца сакратар аўганскага консульства, Ташкента, Алма-Аты і чужаземныя карэспандэнты.

Наблізіцца змыкання распаўраджэньні рэзкі сьвісток абвяшчае пачатак работ на скончэньні ўкладчыкі. Чуецца «Інтэрнацыянал».

А 9 гадз. Турксібмагістраль гатова да руху. На трыбуну ідуць чыгункі т. Шатаў і іншыя. Ён прачытаў ад ўрадавай каманды:

— 28-га красавіка ў 8 гадзін 30 мінут на станцыі Айна-Булак Турксібу, якая адстаіць ад паўднёвай пачатковай веткі—Луга-вой на 642 клм., ад паўночнай—Семіпалацінска—на 800 клм., закончана ўкладка галоўнага палатна магістралі агульнай даўжынёй у 1.442 клм. Укладка першага зьвяна пачата ў Сяміпалацінску 15-га ліпеня 1929 году, на станцыі Лугавая—19-га лістапада 1927 году. Змычка рэйкавай калеі выканана на 17 месяцаў раней тэрміну.

Ад імя чырвонага калектыву будаўнікоў Турксібу запэўняю, што намі будуць прыняты ўсе меры і адданы ўсе сілы і веды на далейшае пасьпяховае заканчэньне вялікай магістралі.

Рапарт скончан. Гучнае «ўра» пакрывае яго прамову.

* * *

АЙНА-БУЛАК, 28. (Ад наш. спэц. кар.). Грамавое «ўра» шматтысячнага натоўпу, калі Шатаў забіў апошні костыль і рапартаваў аб скончэньні Турксібу. Мітынг ператварыўся ў грандыёзную дэманстрацыю пры ўдзеле насельніцтва з далёкіх аулаў. Паведамленьне т. Рыскулова аб узнагародзе гэроям будаўніцтва спаткана буркымі воплескамі. Пасьля мітынгу ў Казахстане адбудуцца нацыянальныя бягі-байга.

Выкрытая фашысцкая правакацыя

ДЭПУТАТ ТАРАШКЕВІЧ ВЫЗВАЛЕНЫ З ТУРМЫ ПАМІМА ЯГО ВОЛІ

ВАРШАВА, 27. Вызвалены з турмы былы дэпутат сойму Тарашкевіч, галоўны абвінавачаны па працэсе Грамады.

ВАРШАВА, 27. Высьвятляецца, што часовае вызваленьне з турмы аднаго з правадыроў Беларускай Грамады, Тарашкевіча, адбылося ПАМІМА ЯГО ВОЛІ. У канцэлярыі турмы Тарашкевіч зрабіў ПІСЬМОВУЮ ЗАЯВУ аб тым, што ЁН НЕ ПРАСІЎ ПАМІЛАВАНЬНЯ, НЕ ПАДАВАЎ НІЯКІХ ЗАЯЎ І НЯ ВЫЙДЗЕ З ТУРМЫ, КАЛІ АДНАЧАСОВА НЯ БУДУЦЬ ВЫЗВАЛЕНЫ ДРУГІЯ АСОБЫ, ПРЫГАВОРАНЫЯ ПА СПРАВЕ БЕЛАРУСКАЙ ГРАМАДЫ.

Вызваленьне Тарашкевіча пралівае сьвятло на сэнс палітычнай спэкуляцыі пілсудчыкаў, якія настойвалі на вызваленьні Тарашкевіча. Трэба памятаць, што Тарашкевіч, знаходзячыся ў турме, ня раз даваў рашучы адпор падобным спэкуляцыям.

* * *

Гісторыя барацьбы рабочых і сялян Заходняй Беларусі — крывавая гісторыя. Увесь яе шлях усеяны трупамі забітых, закатаваных дзесяткаў тысяч лепшых сыноў працоўных З. Б. Мільёны адчуваюць на сябе ўдары фашысцкага бізуна.

Але нячуваны тэрор ня ў стане задушыць рэвалюцыйныя агні, якія ўсё больш разрастаюцца ў рэвалюцыйны пажар. Фашызм прабуе зьнішчыць рэвалюцыйны рух на ЗБ як шляхам фізычнага зьнішчэньня авангарду рэвалюцыйных сіл і разгрому ўсіх масавых арганізацый, а таксама і шляхам разлажэньня гэтага руху зпутры.

Беларуская Рабоча - Сялянская Грамада была разгромлена. Дзесяткі тысяч яе членаў гніюць у фашысцкіх турмах. Побач з простым разгромам Беларускай Рабоча - Сялянскай Грамады і фізычным зьнішчэньнем яе, фашызм увесь час імкнецца прывязаць да фашысцкай каляўніцы частку кіраўнікоў гэтай Грамады.

Частка былых кіраўнікоў Грамады, якія зьляўляліся папутчыкамі беларускага нацыянальна - вызваленчага руху па чале з Луцкевічам прадаліся фашызму. Прыняўшы ўдзел у БСРГ для таго, каб яе разваліць з сярэдзіны, яны пасьля правалу іх спроб найшлі на простую службу да фашызму, для таго, каб дапамагчы яму разграміць масавы рэвалюцыйны рух, выкарыстоўваючы ў якасьці зброі барацьбы рэвалюцыйны аўтарытэт разгромленай грамады.

Спроба фашызму і Луцкевіча ганебна правалілася, масы не пайшлі за Луцкевічам, масы адразу ўбачылі ў аблічы Луцкевіча — здрадніка іх рэвалюцыйных інтарэсаў.

Для таго, каб узмацніць контр-рэвалюцыйны фронт, фашызм увесь час прабуе перацягнуць на свой бок асноўную групу кіраўнікоў Беларускай Рабоча - Сялянскай Грамады, фашызм асабліва ўвесь час стараецца перацягнуць Тарашкевіча і іншых рэвалюцыйных дзеячоў Грамады ў лягер контр - рэвалюцыі.

Да гэтага часу ўсе спробы ў гэтым напрамку ганебна правальваліся, ня гледзячы на цэлы рад чыста правакацыйных трукаў з боку фашызму. Нагласьць фашысцкіх правакатараў даходзіла да таго, што афіцыйна распаўсюджваліся чуткі аб тым, што Тарашкевіч падаў заяву аб памілаваньні.

Апошняе паведамленьне аб умоўным вызваленьні Тарашкевіча, згодна апошніх вестак, зьяўляецца адным з такіх чарговых трукаў пілсудчыкаў, накіраваных да разлажэньня рэвалюцыйнага руху, яго маральнага разгрому.

Варта падкрэсьліць тое, што **Тарашкевіч вызвалены наперакор яго жаданьню, пры яго пратэсьце, пры яго адмаўленьні выйсьці з турмы без таварышоў.**

Толькі гнуснай правакацыяй можна назваць гэтую спробу шляхам вызваленьня Тарашкевіча дабіцца паслабленьня рэвалюцыйнага руху.

Апошні трук фашызму асуджаны на правал, як і ўсе мінулыя.

Напярэдадні 1 мая ў фашысцкай Польшчы

Сёлета 1-га мая польскі пралетарыят будзе сьвяткаваць у абстаноўцы надзвычай абвостранага клясавага змаганьня. Усё ўзрастаючы эканамічны крызіс давёў рабочыя і сялянскія масы Польшчы да крайняга ўбоства. Палова прамысловых рабочых апынулася без работы і бяз усякіх сродкаў да жыцьця. Нават буржуазная статыстыка прызнала, што з агульнага ліку 880.000 прамысловых рабочых у Польшчы 300.000 беспрацоўных і 150.000 часткова беспрацоўных. Сапраўды-ж справа значна горшая. На вёсцы — каля 2.000.000 батракоў і беднякоў, страціўшых работу ў рэзультаце польска-нулацкай «аграрнай рэформы». Але нават занятыя на вытворчасьці рабочыя жывуць у надзвычайнай галечы. Заработак у 5 злот. у дзень (1 р. 12 к.) лічыцца ў Варшаве «добрым», у той час, калі нават паводле афіцыйнай статыстыкі пражытачны мінімум — 12 злот. у дзень. Звычайны заработак работніцы ў Варшаве ў сярэднім 15 злот. у тыдзень (3 р. 33 к.). Яшчэ горшая справа ў правінцыі, дзе заработкі значна ніжэйшыя.

Амаль галадае таксама і вёска. Селянін-серадняк, які да вайны не прадаваў хлеба, цяпер для пакрыцьця запазычанасьці і ўплаты надмерных падаткаў прадае свой хлеб, сам-жа з сям'ёй харчуецца бульбай. Становішча працоўнага сялянства бязвыходнае. Вёска праз меру перанаселена. Зямельныя надзелы надзвычай здрабнелі і ня ў стане пракарміць сялянскую сям'ю. Эміграцыя ў горад нямысьліма, бо прамысловасьць знаходзіцца ў хранічным заняпадзе і ня ў стане даць работу нават палове прамысловых рабочых. Амаль спынілася эміграцыя за мяжу, з прычыны закрыцьця амэрыканскага рынку працы.

У Варшаве хуткая дапамога кожны дзень падбірае на вуліцах рабочых, якія трацяць прытомнасьць з-за голаду. Паміраючыя з голаду, беспрацоўныя капаюцца ў памыйных ямах, выбіраючы адтуль рэшткі ежы. Пад мастамі начуюць шматлікія сем'і беспрацоўных, выселеныя дамаўласьнікамі за няўзнос кватэрнай платы. На ваколіцах гораду сотні і тысячы рабочых сем'яў жывуць у ямах, выкапаных ў зямлі і прыкрытых дошкамі. У рабочых кварталах — сотні і тысячы змучаных голадам рабочых з безнадзейна блукаючымі вачыма. Гэта — беспрацоўныя. Колькасьць самагубствам бязупынна ўзрастае.

У гэтых умовах у Польшчы за апошнія часы назіраецца магутны ўздым рэвалюцыйнай хвалі. Польскі рабочы і працоўны селянін усё больш выразна ўсьведамляюць, што адзіны для іх выхад — гэта шлях непасрэдна рэвалюцыйнага змаганьня за зьвяржэньне капіталістычнага ладу і стварэньне рабоча-сялянскай савецкай рэспублікі. Аб гэтым выразна гаворыць падзеі хаця-б толькі 10 апошніх дзён.

11-га красавіка ў г. Радоме адбылася дэманстрацыя беспрацоўных, накіраваная супроць мясцовага гарадзкога самакіраўніцтва, якое знаходзіцца ў руках сацыял-фашыстых. Да гарадзкога галавы зьявілася дэлегацыя жонак рабочых з патрабаваньнем дапамогі. Ім адмовілі. У адказ на гэта беспрацоўныя разграмілі будынак самакіраўніцтва. Адбылася бойка беспрацоўных з паліцыяй. Шмат параненых і арыштаваных рабочых.

Амаль адначасова ўсе рабочыя г. Алькуша ў адказ на звальненьне палавы рабочых фабрыкі «Вістэн» разграмілі кантору і вывезьлі дырэктара на тачцы. Сутычка з паліцыяй. Параненыя і арыштаваныя. Уласьнікі закрылі фабрыку і абвясьцілі лёкаут. 1.300 рабочых — перад тварам галоднай сьмерці.

14-га красавіка ў Тамашове Мазавецкім — дэманстрацыя беспрацоўных. Патрабуюць дапамогі. Адмаўленьне. Працэсія рабочых з чорнай труной, якая сымбалізуе сьмерць буржуазіі. Сутычка з коннай і пешай паліцыяй. Параненыя і арыштаваныя. 15 і 16 красавіка дэманстрацыі беспрацоўных у Саснавіцу (Дамброўскі вугольны басэйн). Патрабуюць дапамогі. Адмаўленьне. Сутычкі з часьцямі паліцыі. Шмат параненых рабочых. Паранена такдама некалькі паліцэйскіх. Шмат арыштаваных.

16 красавіка такія-ж падзеі ў г. Бэндзіне.

17-га выступленьне беспрацоўных у г. Чэлядзі. Бой з паліцыяй. Параненыя і арыштаваныя. 19 красавіка крывавыя падзеі ў г. Заверце. 5-цігадзінны бой рабочых з паліцыяй і вайсковымі часьцямі. 2 рабочых забіта, 20 цяжка паранена, некалькі дзесяткаў лёгка паранена. Пацярпелі і паліцэйскія, сярод якіх некалькі параненых. Дзесяткі арыштаваных. Стан аблогі, белы тэрор.

Гэты кароткі пералік падзей — нязмуненны довад росту клюсавай сьвядомасьці і рэвалюцыйнага ўздыму пралетарыяту ў Польшчы.

Кампартыя Польшчы зьвярнулася да рабочых з заклікам ЗГУРТАВАЦЦА 1-га МАЯ ПАД СЬЦЯГАМІ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ. Кампартыя заклікае да змаганьня ЗА ЗВЯРЖЭНЬНЕ ПОЛЬСКАГА ФАШЫЗМУ, ЗА СТВАРЭНЬНЕ ПОЛЬСКАЙ САВЕЦКАЙ РЭСПУБЛІКІ І ДА АБАРОНЫ САВЕЦКАГА САЮЗУ, АДЗІНАЕ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ ПРАЦОЎНЫХ УСЯГО СЬВЕТУ.

Рыхтуецца да 1-га мая і буржуазія. Ужываюцца меры для забароны рэвалюцыйным рабочым дэманстрацый. З 30 красавіка ваенныя гарнізоны будуць прыведзены ў баявую гатоўнасьць. Рабочыя акругі наваднюцца атрадамі паліцыі, узброенай вінтоўкамі, кулямётамі, гранатамі і газавымі бомбамі. Гэтымі днямі ў арыстакратычным квартале Варшавы паліцыя практыкавалася ва ўжываньні газавых рэвальвэраў.

Ліхаманкава рыхтуюцца таксама сацыял-фашыстыя, якія добрасумленна дапамагаюць буржуазіі кожны год расстрэльваць першамайскія дэманстрацыі.

Ня гледзячы на ўсё гэта, польская рабочая кляса ў дзень 1-га мая будзе дэманстраваць сваю рэвалюцыйную салідарнасьць з міжнародным пралетарыятам і асабліва з рабочымі Савецкага Саюзу, якія з посьпехам будуюць сацыялізм і паказваюць прыклад рабочым усіх краёў.

А. П.

„Кэльнішэ Цэйтунг" аб савецка-нямецкіх адносінах

БЭРЛІН, 27. «Кёльнішэ-Цэйтунг» зьмясьціла на відным месцы артыкул пад загалоўкам «Прыяцельская гутарка з Масквою», паведамляючы, што артыкул атрыманы з Савецкага Саюзу і, відавочна, адлюстроўвае думкі кіруючых палітычных колаў СССР.

У артыкуле зазначаецца, што дыскусія аб савецка-нямецкіх адносінах у нямецкім друку ў апошнія месяцы выклікае вялізнае зьдзіўленьне ў колах савецкай грамадзкасьці. Савецкая грамадзкасьць чакала, што Нямеччына пасьля прыняцьця пляну Юнга, асабліва пасьля падпісаньня польска-нямецкага ліквідацыйнага дагавору зробіць прыязны гэст у бок Савецкага Саюзу. Гэтае чаканьне было зусім натуральным, бо пры ўсякім рашаючым кроку Нямеччыны ў бок Захаду, у нямецкай грамадзкасьці заўсёды ўзьнікала імкненьне зьвязаць гэты крок з адпаведным палітычным выступленьнем на Ўсходзе, каб не стварылася ілюзыя-ўражаньня, што Нямеччына арыентуецца ў адзін паўны бок. Паводле слоў артыкулу, гэта не азначае, што павінен быў быць заключаны новы дагавор паміж Нямеччынай і Савецкім Саюзам. Чакаўся толькі просты, але яўсім нядвузначны палітычны гэст. Аднак, гэтага ня здарылася і гэта было кепскім прадвесьніцтвам Маўчаньне Нямеччыны можна было ахарактарызаваць, як заціпка перад бурай, і сапраўды бура разрасілася ў выглядзе пячуванага цкаваньня Савецкага Саюзу. З Нямецкага боку былі высунуты папрокі і скаргі, адсутнасьць якіх заўсёды складала актыў нямецка-савецкіх адносін. Хто ўменшае ў нямецка-савецкую дыскусію пытаньне аб Камінтэрне, Нямецкай кампартыі, той сьвядома падрывае адносіны паміж абедзьвюма дзяржавамі. Пытаньні зьяўляюцца і павінны застацца пытаньнямі нямецкай унутранай палітыкі.

Савецкі Саюз ня мае намеру зьмешваць унутраную і замежную палітыку у адзін клубок. Іменна таму савецкая грамадзкасьць рашуча адхіляе таксама спробы зьвязваць Рапальскі дагавор з пытаньнем існаваньня або ліквідацыі нэпу. Рапальскі дагавор быў выяўленьнем прыязных савецка-нямецкіх адносін, незалежных, ад унутрана-палітычных фактараў. Трэба спадзявацца, што гэтыя адносіны працягваць існаваць. Прыязныя перагаворы на гэту тэму маглі-б быць плённымі і зараз, бо думка, быццам індустрыялізацыя і калектывізацыя сельскае гаспадаркі ў Савецкім Саюзе наносіць страты эканамічным інтарэсам Нямеччыны ў СССР зьяўляецца бессэнсоўнай. Наадварот, поле эканамічнай дзейнасьці Нямеччыны ў СССР зараз пашырылася. Трэба забыцца аб тых часох, калі ў Нямеччыне дымілася фабрычныя трубы, а Расія зьяўлялася толькі нейкім аграрным прыдаткам. **Савецкі Саюз імкнецца да таго, каб фабрычныя трубы дымілися ў Нямеччыне і СССР.** Калі адносна гэтага ў Нямеччыне часоў Рапальлё існавалі якія небудзь ілюзіі, дык не справядліва звальваць віну за крушэньне гэтых ільлюзій на Савецкі Саюз.

У заключэньне артыкул адзначае шкоду, якую прычыняе сабе Нямеччына нічкэмная дыскусія, якая (шкода) можа быць выпраўлена шляхам удакладненьня самых асноў савецка-нямецкіх адносін і гэта павінна быць зроблена ў тэрміновым парадку, бо замаруджаньне можа мець сур'ёзныя вынікі.

«Кёльнішэ Цэйтунг» у вялізарным артыкуле ў адказ піша: «Бальшавізм уяўляе сабой гістарычнае зьявішча не выпадковае, а лёгічна нямінучае, без якога нельга сабе сёньня ўявіць ні Расіі, ні сьвету. Крыжовым паходам супроць Савецкага Саюзу нельга выкарчаваць ідэі бальшавізму». Газэта напамінае, што «усякі раз, калі фантазэры ў палітыцы рэкамандавалі прыстасаваньне гэтага радыкальнага сродку, яны зазначала, што вайна Захаду супроць Савецкага Саюзу скарэй можа кончыцца бальшавізацыяй Заходняй Эўропы, чым вызваленьнем яе ад бальшавіцкай небясьпекі». Нямеччына—піша газэта — жадае прыязьні з Савецкім Саюзам і будзе прытрымлівацца у далейшым Рапальскага дагавору, які зьяўляецца сыстэмай створанай у процівагу сыстэме Вэрсалю. Дагавор ужо зрабіў Нямеччыне некаторыя паслугі. Толькі той, хто глядзеў на Рапальлё маючы пры гэтым ільлюзіі, можа быць расчараваны. Пасьля ліквідацыі ільлюзій неабходна ўліць у старыя мяхі Рапальлё новае чыстае віно. З савецкага боку выказваецца жаданьне стварыць такія адносіны, пры якіх трубы прамысловасьці дымілісь-б у абодвух краёх. З нямецкага боку ня будуць сунярэчыць супроць перагавораў, якія маюць на ўвазе такую мэту, але зразумела, што пры гэтым павінны быць высунуты нямецкія патрабаваньні, якія, да рэчы, ужо прадаўлены.

УЗМАЦНЕНЬНЕ ТЭРОРУ У НЯМЕЧЧЫНЕ

БЭРЛІН, 28. Газэта «Вэльт ам Абэнд» паведамляе, што ўсенямецкі ўрад запрапанаваў правінцыяльным урадам узмацніць прасьледваньне рэвалюцыйных арганізацый. Паліцэй-прэзыдэнты буйных гарадоў атрымалі ўжо спэцыяльныя інструкцыі на час першамайскай кампаніі. У выніку гэтага ў Берліне і многіх правінцыяльных гарадох ўзмацнілася хвала арыштаў і рэпрэсій. Сёньня канфіскавана камуністычная газэта «Заксішэ Арбэйтэр Цэйтунг» у Дрэздэне за надрукаваньне першамайскае адозвы кампартыі.

У Заходняй Нямеччыне паліцыя зрабіла шмат вобыскаў і арыштавала некалькі ўдзельнікаў дня моладзі. Біржа працы прабуе пазбавіць дапамогі беспрацоўных удзельнікаў дня або скараціць дапамогу.

Крывавы Цэргібель пагражае ўжыць рашучыя меры

БЭРЛІН, 28. Берлінскі паліцэй-прэзыдэнт Цэргібэль паведаміў прадстаўніку газэты Вэльт ам Монтаг», што ён прыме самыя рашучыя меры да таго, каб «забараніць аўтарытэт дзяржавы ў дзень 1-га мая. Цэргібель паведамляе, што ў раёнах летаішніх першамайскіх барыкад будуць згуртаваны асабліва значныя паліцэйскія сілы. У заключэньне Цэргібель заявіў.

«Паліцыя павінна так магутна выступіць, каб ужо адной сваёй шматлікасьцю прадэманстраваць сілы рэспублікі. Я гэта зраблю, нават ня лічачыся з тым, што камуністычная партыя закліча гэтыя мерапрыемствы, як паліцэйскую правакацыю». (ТАСС).

ПЕРАВЫБАРЫ ІДУЦЬ

711 чырвонаармейцаў і камандыраў №-скай дывізіі падалі калектыўную заяву дывізійнай партканфэрэнцыі аб ўступленьні ў партыю. У Гомелі адкрываецца XI Залінейная партканфэрэнцыя. Фрунзэўскі РК разгортвае надрыхтоўчую работу. У Полацку ў радзе арганізацый перавыбары праходзяць дрэнна.

ВІЦЕБСК. З вялікім уздымам на аснове шырокай самакрытыкі прайшла XIX партыйная канфэрэнцыя №-скай дывізіі. Канфэрэнцыя рашуча падкрэсьліла патрэбнасьць далейшай мабілізацыі партыйных мас на барацьбу з правым апартунізмам, які застаецца галоўнай небясьпекай і з «левымі» загібшчыкамі —саюзьнікамі правых.

Канфэрэнцыя абмеркавала пытаньні баявой падрыхтоўкі і работы дывізійнай партарганізацыі. Асаблівую ўвагу канфэрэнцыя зьвярнула на ўзмацненьне тэарэтычнай вучобы і палітычнага выхаваньня кандыдатаў партыі. Па гэтым пытаньні канфэрэнцыя дала выразныя дырэктывы аб шырокім разгортваньні палітвучобы сярод новых кадраў партыйцаў.

Улічваючы шматлікія пастановы чырвонаармейскіх сходаў, канфэрэнцыя пастанавіла абвясьціць дывізію **ўдарнай.** У часе дзелавой работы ў прэзыдыум канфэрэнцыі паступіла калектыўная заява ад 711 байцоў і камандзіраў аб прыёме ў рады КП(б)Б. У заяве, між іншым, гаворыцца:

«Мы просім прыняць нас у рады партыі, каб пад яе сьцягам прымаць актыўны ўдзел у сацыялістычнай перабудове нашага краю».

Сярод падаўшых заявы 310 рабочых, 188 калгаснікаў, 73 батракі і рэшта—сяляне-беднякі і сераднякі. Падаў заяву аб прыёме ў партыю камандзір Краснаштадзкага ўдарнага палка тав. **Мапіньнікаў.**

ГОМЕЛЬ. У **Залінейным** раёне адкрываецца XI раённая партканфэрэнцыя. У сувязі з канфэрэнцыяй, Цэнтральны Камітэт КП(б)Б зьвярнуўся з прывітаньнем, у якім вызначае задачы, якія стаяць перад Залінейнай партыйнай арганізацыяй.

«Задача Залінейнай арганізацыі—гаворыцца ў прывітаньні ЦК—як партыйнай арганізацыі аднаго з найбольш буйных прамысловых цэнтраў Беларусі, яшчэ больш разгарнуць самую шырокую самакрытыку, мабілізаваць усю партыйную масу, усіх рабочых раёнаў на зьнішчэньне прарываў, меўшых месца ў Гомельшчыне, мабілізаваць рабочую масу вакол барацьбы за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, колькасных і якасных паказальнікаў чыгуначнага транспарту, за ўзмацненьне кіраўнічых кадраў і мабілізацыю партыйных і рабочых мас вакол гаспадарчых задач транспарту, за ператварэньне сацыялістычнага спаборніцтва ў штодзенны метад работы, за лепшую гаспадарча-тэхнічную арганізацыю працы ўдарных брыгад».

МЕНСК. Фрунзэўскі раённы камітэт партыі разгарнуў шырокую падрыхтоўку да раённай партканфэрэнцыі. Па ўсім раёне праходзяць куставыя сходы ячэек, дзе абмяркоўваецца справаздача РК КП(б)Б.

26-га красавіка адбыўся куставы сход у клюбе друкароў. З дакладам аб работе райкому выступіў сакратар РК тав. **Шпэктараў.** У спрэчках выказаліся т. т. **Чорнабродаў, Доўгаполаў, Чарнецкі** і інш. З вялікай прамовай выступіў тав. **Чарвякоў.** Дакладная справаздача аб гэтым сходзе будзе зьмешчана ў адным з бліжэйшых нумароў **«Зьвязды».**

ПОЛАЦАК. У раёнах разгарнулася справаздачна-перавыбарчая кампанія парторганаў. Папярэднія весткі з месц сьведчаць аб тым, што цэлы рад партыйных ячэек зусім дрэнна падрыхтаваліся да перавыбараў. Неадвальняюча праходзяць перавыбары ў Вульскай партыйнай арганізацыі. Большасьць бюро ячэек не падрыхтавала справаздачных дакладаў. Батрацка-бядняцкія і серадняцкія масы ня прымаюць удзелу ў справаздачна-перавыбарчых сходах.

Перад зьлётам ударнікаў БВА

(Ад нашага спэцыяльнага караспандэнта)

25-красавіка ночу ў Бежыцу прыбылі дэлегаты зьлёту ўдарнікаў БВА.

Пралетарыят Бежыцы наладзіў урачыстае спатканьне перадавым байцом-ударнікам. Увесь горад упрыгожаны лёзунгамі, плякатамі і сьцягамі. Дом абароны Асоавіяхіму ўпрыгожаны прывітальнымі сьветавымі лёзунгамі. У Доме Культуры, дзе адбудзецца зьлёт, наладжваецца вялікая выстаўка дасягненьняў часьцей акругі па баявой падрыхтоўцы і заводу «Красный Профинтерн». Уся работа зьлёту будзе засьнята экспэдыцыяй Саўкіно, якая спэцыяльна для гэтага прыехала.

Выпушчаны спэцыяльны нумар друкаванай газэты «Красный Профинтерновец», прысьвечан першаму зьлёту ўдарнікаў

ЧАМУ ВУЧЫЦЬ НАС СПРАВА ПОЛАЦКІХ КААПЭРАТАРАЎ

Выкрытыя агідпасьці ў рабоце Полацкага аддзяленьня БКС — скрыўленьне клясавай лініі, сямейнасьць, самазабесьпячэньне, растраты, засьмечанасьць апарату чужымі элемэнтамі — і тая вусім правільная ацэнка, якая дана гэтым фактам пастановай ЦКК ад 24 красавіка 30 г. павінны шмат чаму навучыць каапэрацыйных працаўнікоў БССР.

Урокі Полацку прымушаюць усе арганізацыі спажывецкай каапэрацыі сур'ёзна падумаць над тым, ці добра стаіць справа ва ўсіх іншых нашых арганізацыях і ў кожнага ў паасобку.

Першае пытаньне — пры якіх умовах магло адарыцца гэтае разлажэньне ня толькі амаль усяго апарату Полацкага аддзяленьня, але і асобных зьвеньняў яго сыстэмы?

На гэтае пытаньне мы павінны даць наступны адказ — **усё гэта здарылася па тэй прычыне, што ў Полацкім аддзяленьні зусім адсутнічала кіраўніцтва сыстэмай і ніякага арабочаньня апарату не праводзілася. Дырэктыва партыі аб ачышчэньні апарату ад усяго чужога, непралетарскага, што скажае клясавую лінію, ня выканана.** Роўным чынам ня было кіраўніцтва і кантролю з боку адпаведных акруговых арганізацый у той час, калі гэтае кіраўніцтва і кантроль за работай спажывецкай каапэрацыі, якая выконвае адказьнейшыя задачы партыі і ўраду, асабліва важна і неабходна.

Другое пытаньне — чаму да прыезду праверачнай камісіі на чыстцы апарату БКС ня былі выкрыты ўсе гэтыя факты? Бо за апошні-ж час там пабывала шмат усялякіх інструктароў.

Тлумачыцца гэта тым, што існуючыя формы і мэтады работы ня толькі ў Полацкім аддзяленьні, але і ва многіх іншых нашых арганізацыях настолькі няпрыдатныя, настолькі гнілыя, настолькі бюракратычныя, што яны ня могуць дапамагчы хуткаму выкрыцьцю злачынстваў.

Праца ўсіх нашых інструктароў і рэвізораў і тым самым усіх нашых арганізацыйных апаратаў яшчэ і па гэты дзень праводзіцца бюракратычнымі чыноўніцкімі мэтадамі, без уцягненьня ў абсьледваньне рабочых, бядняцкіх і батрацкіх мас, без разгортваньня вакол усёй абсьледваўчай работы крытыкі і самакрытыкі, г. зн. без якога-б там ні было грамадзкага кантролю.

Перад спажывецкай каапэрацыяй наша партыя паставіла рад важнейшых палітычных і гаспадарчых задач; да апошняга часу мы іх выконваем далёка ня так, як гэтага патрабуе наша партыя; **у нашай рабоце ёсьць шмат прарываў і недахопаў і таму было-б няправільна, калі-б мы сказалі, што прарывы маглі мець месца толькі ў адным Полацку.**

Зусім бясспрэчна, што каапэрацыйная сыстэма вельмі марудна перабудоўваецца, тэмпы працы далёка не забясьпечваюць выкананьня складаных задач. Апараты, як і раней, засьмечаны чужымі элемэнтамі. Не выдаецца жорсткая барацьба са скрыўленьнямі. **Вылучэньне рабочых і бядняцка - батрацкіх мас на каапэрацыйную работу ідзе вельмі слаба.** Крытыка і самакрытыка зусім слаба разгорнуты. Грамадзкі кантроль амаль адсутнічае.

Што зрабілі прадстаўнікі камісіі НК РСІ, якія выяжджалі ў Полацак? Аспуднае, гэта — **прыцягнулі масы, разгарнулі крытыку і самакрытыку вакол дзейнасьці, як аддзяленьня, так і асобных спажывецкіх таварыстваў** (а крытыкавань нашу работу сапраўды ёсьць за што). Толькі на базе гэтага ім удалося выкрыць усе гэтыя агідпасьці, чаго не маглі зрабіць да гэтага часу ўсе нашы рэвізоры, інструктары і г. д. Ці гэта ня ўрок для ўсіх?

Ці гэта не паказвае на вялікія недахопы ў інструктарскай рабоце?

На уроках Полацкіх мы павінны разгарнуць масавую работу сярод рабочых, бядняцка - батрацкіх мас, мабілізаваўшы іх увагу вакол работы спажывецкай каапэрацыі, узмацніўшы кантроль над усёй работай сыстэмы як у горадзе, так і ў вёсцы.

Г.ХАСКІН.

ТЭМП СЯЎБЫ У ІНДЫВІДУАЛЬНЫМ СЭКТАРЫ УСЕ ЯШЧЭ НЕВЫСТАРЧАЛЬНЫ

КАЛГАСЫ, ЯКІЯ З ПОСЬПЕХАМ ПРАВОДЗЯЦЬ СЯЎБУ, ДАПАМАЖЭЦЬ БЕДНЯКОМ І МАЛАМОЦНЫМ СЕРАДНЯКОМ-ІНДЫВІДУАЛЬНІКАМ!

ПАСЬЛЯХОВАЯ СЯЎБА Ў КАЛГАСАХ СЕНЬНЕНШЧЫНЫ

Ніякай масавай працы сярод індывідуальнікаў не вядзецца

Калгасы Сеньненскага раёну, Віцебскай акругі, дружна выйшлі ў поле. Большасьць з іх скончыла арацьі прыступіла да сяўбы. З вялікім посьпехам ідуць палявыя работы **ў камуне «Мир».** Ня гледзячы на тое, што ў ёй адчуваецца недахват рабочай сілы, **яна свой плян сяўбы скончыць раней вызначанага тэрміну. Камуна пачынае дапамагаць больш слабым калгасам.** Трэба, аднак, адзначыць і адмоўныя бакі, якія наглядаюцца па некаторых калгасах раёну.

Машынісьці калгасаў і разьвіцьцю асобных галіц перашкаджае боязнь некаторых калектыўных гаспадарак «залазіць у крэдыты». Ня гледзячы на тое, што **крэдыты** ёсьць, яны з гэтае прычыны **не скарыстоўваюцца.**

Ёсьць асобныя калгасы, якія агароджваюцца ад індывідуальнікаў, **не жадаючы павялічваць свой склад.** Прыкладам можа служыць арцель «Чырвоная Гара». Гэты калгас мае свой млын і выяўляе сабой даволі моцную гаспадарку. **За цэлы год свайго існаваньня арцель не прыняла ніводнага новага члена.**

Калгасьнікі з арцелі Турава асьвятляюць свой калгас перад сіламі толькі з дрэннага боку. Ёсьць усе падставы меркаваць, што гэта робіцца для таго, каб індывідуальнікі ня падта дабівалися прыняць іх у Тураўскую арцель. Між іншым, тым, хто жадае ўступаць у арцель, адмаўляюць у гэтым.

Гэтыя асобныя недахопы і буйныя непармальнасьці ня могуць, аднак, зьнізіць значэньня добрага ходу сяўбы ў сацыялістычным сэктары. **Посьпех веснавой кампаніі па калгасах Сеньненшчыны, бязумоўна, забясьпечаны.**

Іншы малюнак выяўляе сабою індывідуальны сэктар. Ёсьць такія вёскі, якія яшчэ не пачалі араць, бо ім не паказан яравы клін. У раёне налічваецца 8-9 проц. такіх індывідуальных гаспадарак, якія ня маюць зусім рабочай скаціны. Як яны будуць апрацоўваць сваё поле—ніхто ў раёне аб гэтым ня думае. Камітэты сялянскай узаемадапамогі не падрыхтаваліся да арганізацыі дапамогі бядняцкім гаспадаркам. Толькі зараз пачынаюць забясьпечваць індывідуальнікаў с.-г. інвэнтаром. І гэта ў той час, калі на складах раёну ёсьць нераспрадапага с.-г. інвэнтару на 14.000 руб. Крэдыт бядняцкім і маламоцным серадняцкім гаспадаркам яшчэ не выдаецца. Некаторыя сельсаветы не падалі яшчэ нават сьпісаў маламоцных гаспадарак, якія адчуваюць патрэбу ў крэдытах, ня гледзячы на тое, што раён ужо некалькі раз патрабаваў іх падачы. Сельсаветы наогул яшчэ нічога не зрабілі, каб забясьпечыць поўнае выкананьне пасеўнага пляну ў індывідуальным сэктары. Ніякай масавай работы сярод індывідуальнікаў за пашырэньне пасеўнай плошчы не вядзецца.

Яшчэ ёсьць такія сельсаветы, якія ня скончылі ачысткі насеньня.

У раёне налічваецца каля 50.000 пудоў аўсу, заражонага галоўнёй, але яшчэ не мабілізавана ўвага калгасьнікаў і індывідуальнікаў па неабходнасьць абавязкова пратруціць гэты авёс.

Брыг. «Зьвязды» ТАМІЛІН.

КАМУ ПАТРЭБНА САМААШУКАНСТВА?

У № 70 газэты «Зьвязда» ад 5 красавіка г. г. была надрукавана тэлеграма сакратара Хойніцкага райкому КП(б)Б т. Аўласенкі, у якой характарызуецца падрыхтоўкай да веснавой сяўбы ў раёне.

У гэтай тэлеграме адзначана:

Што на 1 красавіка пад калгасамі было 70 проц. плошчы раёну.

Усе калгасы пераведзены на новы статут.

Усе калгасы зямляўпарадкаваны — 26 калгасам выдзелена ўся плошча, а 20 — яравы клін.

Групы беднаты ўсюды арганізаваны, 15 з іх працуюць добра.

Індывідуальным гаспадаркам, якія ня ўвайшлі ў калгас, яравы клін паказаны амаль ва ўсіх сельсаветах і што наогул усё вельмі добра за нязначнымі выключэньнямі.

Зьмяшчаючы гэта паведамленьне, рэдакцыя ў канцы тэксту прасіла работнікаў раёну падзяліцца праздрук аб тых мэтадах працы, пры дапамозе якіх арганізацыі раёну дабіліся такой хуткай ліквідацыі дапушчаных хібаў і памылак, каб азнаёміць з імі іншыя раёны.

Мне прышлося быць у Хойніцкім раёне 9 красавіка, гэта значыць на 2—3 дзень па атрыманьні № 70 «Зьвязды» ў Хойніках. **Тое становішча, якое я там спаткаў, далёка не адпавядае таму, аб чым пісаў т. Аўласенка. Вось пацьвярджэньне гэтага.**

Па вестках райкалгасаўсу ў Хойніцкім раёне было аб'яднана ў калгасы: на 20 красавіка — 3.360 двароў (54 проц.), на 2 красавіка — 3.124 двароў (48 проц.) і на 8 красавіка — 2.015 двароў (31 проц.).

Наводзе тлумачэньня старшыні райкалгасаўсу т. Шніцара, весткі на 8 красавіка не адпавядаюць сапраўднасьці, бо лік двароў у калгасах у сапраўднасьці значна меншы.

Па заяве таго-ж т. Шніцара, а таксама і іншых работнікаў раёну, у вёсках Небытава, Казелужжа, і Іноева ня выдзелены яравы клін для індывідуальнікаў.

На 8 красавіка, ня гледзячы на тое, што сяўба ў саўгасах і некаторых калгасах ужо пачалася, індывідуальныя гаспадаркі да сяўбы яшчэ ня прыступілі.

Ці можна пасьля гэтага гаварыць, што ў раёне 70 проц. плошчы пад калгасамі, усе калгасы зямляўпарадкаваны, індывідуальным гаспадаркам, якія не ўвайшлі ў калгасы, яравы клін выдзелены, усюды групы беднаты арганізаваны і дырэктывы партыі і савецкага ўраду даведзены да шырокіх колаў насельніцтва?

Каму патрэбна такое самаашуканства? Гэта ні што іншае, як жаданьне заспакоіць пільнасьць партыі і грамадзкасьці ў часе напружанай працы па сацыялістычнай перабудове сельскае гаспадаркі і выпраўленьня памылак, дапушчаных у Хойніцкім раёне ў гэтай працы.

Інструктар Гомельскага акрвалгассаюзу — **А. ЛУБНЕЎСКІ.**

26.600 батракоў і 2000 чыгуначнікаў уступіла ў калгасы

На некаторых прафэсыянальных саюзах Беларусі, якія ў радзе округ правялі масавую работу сярод сваіх членаў саюзаў, зьвязаных з вёскай, дасягнуты значныя вынікі ў справе ўцягненьня іх у навуковыя калгасы.

Найбольшых вынікаў па сёнешні дзень дабіўся саюз сельгаслесарабочых. Ім уцягнута ў калгасы 24.607 батракоў ва ўсіх округах БССР. Праўда, трэба адзначыць, што дырэктыва партыі і ўраду аб уцягненьні ў калгасы 60.000 батракоў да веснавой пасеўнай кампаніі усё-ж нявыкапана саюзам ў вогуле паваг і на 50 проц.

Невыкананьне дырэктывы тлумачыцца слабай работай адзяленьняў саюзу сельгаслесарабочых у радзе раёнаў, дзе ў калгасы ўступіла фактычна ўсяго 2-5 батракоў. З другога боку, некаторыя праўленьні калгасаў правялі абурэчныя адносіны да прыёму батракоў у калгасы, усімі мерамі імкнучыся ня прымаць іх у склад калгасьнікаў з тэй прычыны, што яны, нібыта, будуць абузаю для гаспадаркі.

Варта адзначыць, што ў часе адліву з калгасаў амаль ня было ніводнага выпадку выхаду батракоў. Толькі ва Ўваравіцкім раёне, Гомельскае округі, з калгасу выйшла некалькі батракоў з тэй прычыны, што ніхто не клапаціўся, каб забясьпечыць іх мінімальныя матар'яльныя патрэбы.

Значна менш увагі было саюзам сельгаслесарабочых зьвернута на ўцягненьне ў калгасы рабочых саўгасаў. Між іншым, аб гэтым няма паваг поўных лічбаў. Вядомы, аднак, выпадкі адміністрацыйнага націску з боку некаторых низавых зьвеньняў прафсаюзу пры ўцягненьні рабочых саўгасаў у калгасы. Так, сельрабачком саўгасу Сьмілавіцкага раёну, Менскае округі, паставіў рабочым такі ультыматум: «або ўваходзьце ў калгас, або «выключым з саюзу».

Значных вынікаў дасягнулі некаторыя вучпрафсоюзы. Так, па Аршанскім вузьле ў калгасы ўступіла 761 рабочых-чыгуначнікаў, зьвязаных з вёскай. На гэтым вузьле прафсаюзнымі арганізацыямі была праведзена вялікая агітацыйная праца. Адбыліся 62 сходы рабочых спэцыяльна па пытаньні аб уступленьні ў калгасы.

Па Віцебскім вузьле ў калгасы ўвайшло 838 рабочых-чыгуначнікаў. Рабочыя, аб'яднаныя ў 12 месцкомах, выпесьлі пастановы аб калектыўнай апрацоўцы зямлі ў паласе адчужэньня.

Па Жлобінскім чыгуначным вузьле ў склад калгасаў увайшло 276 рабочых. У Гомельскім вузьле, пры ст. Мена арганізаваўся паказальны чыгуначны калгас.

Нездавальняючыя вынікі на саюзе хэмікаў. На шкла-прадпрыемствах Беларусі пераважная большасьць рабочых вельмі цесна зьвязана з сельскай гаспадаркай. Многія рабочыя, што працуюць на гутах, маюць уласныя сядзібы і гаспадаркі. Да гэтага часу, аднак, рабочых-хэмікаў уцягнута ў калгасы каля 50.

А. М.

Хто-ж сарваў збор попелу ў Менску?

КАЛІ БУДЗЕ НАЛАДЖАНЫ ДРУГІ ЗБОР?

У сувязі са зьмешчанымі ў «Зьвязьдзе» артыкуламі аб неабходнасьці паслаць у саўгас імя «Дзесяцігодзьдзя БССР» і ў камуну імя «БВА» па Мар'інскім масыве попел, які знаходзіцца ў Менску і Барысаве. Менскі камсамол, акрпаляводсаюз і Белсельтрэст прызначылі 24-га красавіка арганізаваць масавы збор попелу ў Менску. Аднак, збор быў сарваны.

Менакругком камсамолу паведаміў, што гэта здарылася па віне акрпаляводсаюзу, які ня прыслаў своечасова і ў патрэбнай колькасьці фурманак для нагрузкі попелу. Менакругком ЛКСМБ з свайго боку зрабіў усё магчымае для арганізацыі збору попелу. Былі мабілізаваны 3.000 камсамольцаў і піянэраў, якія павінны былі 24 красавіка а 9-й гадз. раніцы прыступіць да працы, але збор быў адменены з прычыны адсутнасьці фурманак.

Меркавалася, што Белсельтрэст дасьць 30-40 фурманак, вайсковыя часьці 120. Акрпаляводсаюз павінен быў канкрэтна дагаварыцца з вайсковымі часьцямі адносна гэтага, аднак, ён гэтага не зрабіў. Белсельтрэст таксама ня прыслаў патрэбнай колькасьці фурманак. Усяго ў назначаны час зьявіліся 12 саўгаскіх фурманак. Зусім зразумела, што з такой колькасьцю фурманак нельга было пачынаць масавага збору.

Прадстаўнік акрпаляводсаюзу т. Зянькевіч па запытаньне калі-ж, нарэшце, будзе наладжаны збор попелу, заявіў: «Як мы даведаліся, у Менску можна сабраць найбольш 400-500 пуд. попелу, таму ня мае ніякага сэнсу арганізацыя масавага збору».

У Беліцкымсаюзе мы ўстанавілі, што заява т. Зянькевіча зусім не ўгрунтавана. Жактаўскія дамы маюць 450 скрынь для попелу. Кожная скрыня зьмяшчае ў сабе сярэднім 12-15 пудоў попелу. Паводле паступаючых з жактаў вестак, скрыні ўжо перапоўнены і няма куды выбіраць з іх попел. Такім чынам, у Менску ў адных жактаўскіх дамох ёсьць ад 5 да 7 тысяч пудоў попелу. А колькі яго на заводах і фабрыках?—Нікому не відома.

Вывады ясныя: трэба бліжэйшымі днямі арганізаваць паўторны масавы збор попелу і адаслаць яго на Мар'іна.

Вінаватыя ў зрыве збору попелу павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

За утыльсырэц—за трактар!

Загатоўкі другарадных відаў сырцу праходзяць нездавальняюча

Загатоўкі утыльсырцу праходзяць па БССР вельмі слаба. Гадавы плян па асноўных відах утыльсырцу — РЫЗЬЗІ выкананы за першае паўгодзьдзе на 28 проц. і па КАСЬЦЁХ — на 27,7 проц.

Такі ход загатовак пагрожае забясьпячэньню прамысловасьці патрэбным сырцом і выкананьню экспартнага пляну.

Нашыя загатоўшчыкі да апошняга часу ня здолелі перабудаваць сваёй работы і ўсё яшчэ спадзяюцца, што утыль пападзе да іх самацёкам. Ніякай увагі не зварачаюць яны на арганізацыю грамадзкасьці вакол гэтага важнейшага пытаньня.

Белдзяржгандаль выканаў плян загатовак рызьзя толькі на 20 проц., а спажывецкая каапэрацыя плян загатоўкі касьцей — на 17,7 проц.

Найгорш праходзіць загатоўка ў Мазырскай акр., якая выканала плян загатовак рызьзя на 14 проц. і касьцей — на 15 проц. Трошкі лепей стаіць справа ў Гомельскай і Аршанскай акругах. Менская, Полацкая і Віцебская округі свае заданьні па зборы другарадных відаў сырцу выканалі з перавышэньнем.

На мясцох усё яшчэ адносяцца да збору утылю, як да другараднай справы. Многія РВК лічаць, што збор утылю слаба пастаўлена растлумачальная работа аб зборы утыльсырцу на фабрыках і заводах.

Яшчэ горш стаіць справа са зборам утылю на вёсцы як у калгасах, так і ў індывідуальных гаспадарках. Некаторыя калгасы (Калінкавіцкі раён) запічваюць здадзены калгасьнікамі утыль у запазычанасьць калгасу, пры чым калгасьнік на рукі нічога не атрымлівае.

Пасьляховае выкананьне пляну загатовак утыльсырцу можа даць Беларусі 600 новых трактараў для нашых палёў. ЖАКТ'ы, гарсаветы і прафсыянальныя арганізацыі павінны правесьці шырокую растлумачальную работу сярод усіх рабочых і служачых з тым, каб ні адно кілё утылю не прапала дарма.

М. А.

11 новых радковых сявярак не скарыстоўваюцца

Вінаватых да адказнасьці

Прапойскі райкалгассаюз атрымаў са складу Магілеўскага акрпаляводсаюзу 11 радковых сявярак вырабу харкаўскіх заводаў. Сявяркі былі разьмеркаваны па калгасах «Камунар», імя Сталіна і інш. Калі прыступілі да сяўбы і хацелі скарыстаць прысланыя сявяркі, дык калгасы сталі перад фактам немагчымасьці прадаваць па гэтых сявярках, бо **не аказалася раду неабходных частак—ланцужкоў, упорных балтоў для тормазаў** і г. д.

Некаторыя калгасы прабавалі замест ланцужкоў скарыстаць вяроўкі, але апошнія рваліся. **Зараз сявяркі стаяць бяз усякага скарыстаньня.**

Раён некалькі раз зварачаўся да акрпаляводсаюзу, але апошні ўсё яшчэ маўчыць. **Трэба РСІ зацікавіцца, хто вінават у тым, што ў самым разгары сяўбы ў калгасах новыя сявяркі не маглі быць скарыстаны.**

Брыгадзір «Зьвязды»
ВОІНАЎ.

Могілкі будаўнічых матар'ялаў на ст. Менск таварная

На пуцях месяцамі валяюцца сотні вагонаў з каменьнем бярвеньнямі

На таварнай станцыі Менскага вузла наглядаецца вялікая бесгаспадарчасьць. Таварная станцыя на прымас ніякіх мер каб вывазьці матар'ялы і тавары, які даўно ляжаць на станцыі. Так, напрыклад, на 747 клм. каля месяца ляжыць 200 вагонаў будаўнічага каменьня, і адным з вучастка — 44 вагоны з вугалем, лесаматар'ялам, жалезам. На 499 клм. тры тыдні ляжаць выгружаныя 15 вагонаў вугалю, 8 вагонаў бярвеньняў і 36 вагонаў каменьняў. На ветцы Белдзяржгандлю на пля трох тыдняў валяюцца пад адкрытым небам 22 вагоны каменьняў. Гэта наглядаецца ў той час, калі нашае будаўніцтва адчувае вострую патрэбу ў будаўнічых матар'ялах.

«Саюзтранса заключыў умову на вывазку гэтых матар'ялаў, але пакуль што нічога ня зроблена. Пуці завалены розными грузамі. І гэта перашкаджае своевасовай выгрузцы прыбываючых матар'ялаў.

Цікава, што таварная кантора нават ня ведае, якія тавары ляжаць на пуцях і ці прыбыў такі і такі тавар, ці не.

Таварныя цягнікі часта адыходзяць с спазьненьнем. Так, напрыклад, у сакавіку значна спазьнілася адпраўка проц. цягнікоў.

Працоўная дысцыпліна на таварнай станцыі ў заняпадзе.

150 грузчыкаў за сакавік зрабілі 1: прагулаў. Быў такі выпадак, калі грузчыкі, якія павінны былі выгружаць жалеза для заводу «Энергія» згадзіліся працаваць па 50 кап. ліст, з потым патрабавалі 80; масцком слаба змагаецца з рвацкімі настроямі рабочых і часта патурае ім.

Зірнеце на таварную кантору. Там адзін супрацоўнік пасылае да другога і ніяк нельга атрымаць патрэбнага адказу. Ніякага падліку адгружаных вагонаў не вядзецца. Пакуль атрымаеш даведку, пройдзе дзень-два.

Патрэбны тэрміновыя меры, каб палепшыць работу таварнай станцыі.

А. М.

Магутнасьць Асінбуду будзе павялічана да 92.000 кілёват

У Электраплане ў Маскве разгледжана пытаньне аб будаўніцтве другой чаргі Асінбуду. Вырашана ўстанавіць на Асінбудзе ў другую чаргу два турбо-генэратары па 12.000 кілёват у дадатак да 2-х турбо - генэратараў па 11 тысяч кілёват, якія зараз пастаўлены.

У трэцюю чаргу на Асінбудзе павінны быць пастаўлены яшчэ два турбо-генэратары па 24.000 кілёват.

Такім чынам, агульная магутнасьць Асінбуду вызначана ў 92.000 кілёват.

Да будаўніцтва другой чаргі прыступяць у бягучым годзе.

20.000 няпісьменных на лікпунктах

Наркамасьветы, ЦСПСБ, ЦК саюзу будаўнікоў, сельска - гаспадарчых рабочых і арбюро саюзу горнарабочых зьвярнуліся да сваіх низавых арганізацый з прапановай разгарнуць работу на лікпунктах у летні час. На мячасцах адкрыць на прадпрыемствах будаўнічых работ, шэрфных распрацоўках каля 1.500 лікпунктаў, якія ахопяць звыш 20 тысяч няпісьменных.

Для непасрэднай работы на лікпунктах і індывідуальнага навучаньня мяркуецца мабілізаваць усіх пісьменных членаў саюзаў, камсамольцаў, старэйшых вучняў сямігодак, ФЗУ, школ сялянскай моладзі. Для падрыхтоўкі лікбідатараў у гарадох і раёнах не пазьней 15-га мая адкрываюцца каротка-тэрміновыя курсы.

Падручнікамі лікпункты будуць забясьпечаны.

ВЫПУСК КУРСАЎ НАЧСКЛАДУ ЗАПАСУ

50 камандзіраў запасу выходзяць узброенымі вайсковымі ведамі, атрымаўшы баявую і палітычную падрыхтоўку

6 месяцаў упартай работы

30-га красавіка адбудзецца выпуск курсаў перападрыхтоўкі нач. складу запасу пры Менакрасоавіяхіме.

Звыш паўсотні камандзіраў і палітрукоў выходзяць з курсаў добра падкавалымі тэарэтычна і практычна, здольнымі ў часе вайны выканаць задачы, настаўленыя перад імі.

Курсанты набылі неабходныя веды ў навейшай тактыцы, у стралковай справе, у палітрабоце і інш.

Як праходзіла вучоба? Праграма курсаў выканана поўнасьцю з перавышэньнем. Асаблівыя ўмовы патрабавалі некаторага зьмяншэньня яе, ліквідаваньня да патрабаваньня курсантаў.

Тактычны цыкль на 85 проц. праходзіўся практычна, мэтадам разьвіцьця задач і вайсковых гульняў. Па тэорыі на курсах даваліся толькі асноўныя даныя, самая-ж тэорыя прапрацоўвалася слухачамі дома і замацоўвалася на задачах.

Былі праведзены выхады ў поле, дзе курсанты выконвалі ролі ня толькі камандзіраў, але і радавых байцоў. Задачы і выхады ў поле навучылі курсантаў хутка разьбірацца ў абстаноўцы, прымаць рашэньні і г. д. На полі прышчапляліся навыкі складаньня розных схэм, справаздачных картак, данясеньняў, скарыстаньня сучасных тэхнічных сродкаў.

Курсанты добра вывучылі **стралковую справу**—кулямёты, спосабы кіраваньня агнём і вядзеньня агню. Праведзены былі баявыя страляньні з рэвальвэраў, вінтовак і кулямётаў.

Добрыя вынікі страляньняў тлумачацца разгортваньнем сацыяборніцтва паміж курсантаў.

Курс палітработы завастрыў увагу курсантаў на пытаньні замежнай і ўнутранай палітыкі, навучыў іх разьбірацца ў палітычных абставінах, у палітыка-маральным становішчы часьці. Палітработа навучыла курсантаў не забываць пры дачы баявых загадаў аб мерах па забясьпячэньні палітыка-маральнага становішча войск, навучыла іх зразумець, што маральная ўстойлівасьць байцоў—адна з асноўных умоў посьпеху.

Курсанты займаліся ў АБВШ, дзе ёсьць добрыя лябараторыі, падобран настаўніцкі склад.

Трэба адзначыць добрыя адносіны курсантаў да заняткаў. Былі дні, калі курсанты цэлы дзень праводзілі ў цірах. За пяць месяцаў вучобы заняткі ні разу ня зрываліся. Наведваньне заняткаў—80—90 проц.

Практыка паказала, што курсы зусім апраўдалі сваё назначэньне. Трэба ў далейшым правесьці вялікую работу па вярбоўцы новых слухачоў, па стварэньні спрыяючых умоў для заняткаў.

Шахлієвіч.

Курсы падкавалі камандзіраў

Курсы начскладу запасу далі шмат карысьці камандзірам. Многія з нас мала што разумелі ў навейшай тактыцы, мала што ведалі аб навейшых дасягненьнях ваеннай тэхнікі.

Курсы пазнаёмілі камандзіраў-запасьнікаў з новымі мэтадамі вайсковай работы, адналілі ў сьвядомасьці тое, што курсанты даўно забылі.

Нельга не адзначыць досыць цяжкіх умоў, у якіх прыходзілася працаваць курсантам. Праца праводзілася адзін раз у пяць дзён з 18 да 22 з паловай гадз. Прымаючы пад увагу, што кожны курсант у гэты дзень працаваў на прадпрыемстве да 18 гадз., дык выйдзе, што ў дзень заняткаў курсанты працавалі больш 12 гадз. Гэта перагрузка ня значна адбілася на заняткам, бо цяга, імкненьне да вучобы было падта вялікае.

Курсы далі ўсё тое, што трэба і можна было даць за такі кароткі тэрмін. На жаль, мала гадзін было ўдзелена тапаграфіі. З прычыны недахвату часу ня былі праведзены практычныя заняткі ў полі.

Курсанты: **А. С. і А. Ю.**

У полі

За час існаваньня курсаў перападрыхтоўкі начскладу было арганізавана некалькі выхадаў у поле, дзе былі праведзены рапэньні задач па тактыцы на мясцовасьці.

Выпускнік т. **ДРЭЙЦІН.**

7-га красавіка—другі выхад. Рота ў абароне. Праціўнік «насядае». Рота спачатку трымаецца стойка, а потым пачынае выходзіць з бою. Пасьля разбору заданьня пераходзім на стрэльбішча. Праводзіцца баявая страляніна.

14-га красавіка — страляньне з кулямётаў. Так, на практыцы, па полі, ва ўмовах бою ўдасканальвалі свае вайсковыя веды камандзіры запасу.

Р—ч.

Час не прайшоў дарма

На перападрыхтоўчых курсах для камандзіраў запасу займалася 50 чалавек. Наведваньне курсаў дасягала ад 80 да 90 проц.

У пачатку работы курсаў некаторыя прадпрыемствы, установы і нават партячэйкі лічылі перападрыхтоўчую працу на курсах для сябе не абавязковай і таму не заўсёды адпускалі сваіх працаўніноў на гэтыя курсы. Потым гэтыя ненармальныя зьявішчы былі зьнішчаны.

Работа на курсах насіла тэарэтычны і практычны характар. Адбылося некалькі тактычных выхадаў у поле, дзе кожны камандзір запасу замацоўваў свае тэарэтычныя веды на практыцы. Праведзена некалькі баявых заняткаў з рэвальвэрам, вінтоўкай і кулямётам розных сыстэм.

На курсах былі нападжаны сацыялістычныя спаборніцтвы паміж паасобнымі слухачамі. Адным словам час, які патрацілі камандзіры запасу на наведваньне курсаў, не прайшоў для іх дарма.

ПЯКУРЫН

Сацспаборніцтва дало вельмі добрыя вынікі

Курсы па перападрыхтоўцы начскладу запасу адкрыліся 1-га сьнежня мінулага году па ініцыятыве акрсавету Асавіяхіму.

Бязумоўна, за 6 месяцаў цяжка было ўсвоіць увесь курс праграмы, але добра пастаўленая арганізацыйная работа, вельмі ўважлівыя адносіны да курсаў з боку адміністрацыі і настаўніцкага складу АБВШ, далі магчымасьць [illegible] пехам прайсьці праграму заняткаў.

АБВШ вылучыла для курсаў лепшых выкладчыкаў.

Курсанты, у мэтах дасягненьня найбольшых посьпехаў у заняткам, арганізавалі сацспаборніцтва паміж групамі і выклікалі па сацспаборніцтва віцебскія, гомельскія і харкаўскія курсы.

Спаборніцтва дало вельмі добрыя рэзультаты. Калі ў лютым было 21,7 проц. процускаў, дык у сакавіку толькі 9,4 проц., з іх усе—па ўважлівых прычынах. Спазьненьняў на курсы ня было. У лютым 75 проц. курсантаў зьяўляліся членамі Асавіяхіму, у красавіку— усе 100 проц.; у лютым газэту «Красная Зьвязда» выпісвала 66,7 проц. курсантаў, у красавіку—98,1 проц. Членамі дому Чырвонай армії ў лютым зьяўлялася 81,7 проц. курсантаў, у красавіку—100 проц. Лік курсантаў, якія прымалі ўдзел у рабоце па вялізацыі ўстаноў, павялічыўся з 43,3 проц. да 66 проц.

Падагульваючы вынікі работы курсаў, трэба адзначыць, што камандзіры запасу вельмі моцна падкавалі сябе. Няхай пра гэта ведаюць імпэрыялістыя, якія рыхтуюць вайну супроць Савецкага Саюзу.

П. БЕРДНІК.

Сельсаветы жывуць яшчэ ўчарайшым днём

Няма яшчэ належнага пералому ў кіраўніцтве калгасным рухам

Ці павярнуліся сельсаветы тварам да калгасаў? Ці перабудавалі сельсаветы ўсю сваю работу пановаму?

Матар'ялы абсьледваньня некалькіх дзесяткаў сельсаветаў паказваюць, што, ня гледзячы на шматлікія пастановы, вывады і рэзалюцыі, у **рабоце многіх перавыбраных і старых сельсаветаў БССР няма яшчэ належнага зруху.** Сельсаветы вельмі марудна адмаўляюцца ад старых мэтадаў работы. На мясцох сустракаюцца факты, калі сельсаветы ня маюць нават плянаў работы.

Як і раней, амаль не працуюць камісіі пры сельсаветах, актыў пазначны. Як і раней, кіраўніцтва калгасным рухам сельсаветамі амаль не ажыцьцяўляецца.

Прыйдзем да канкрэтных фактаў з практыкі РВК і сельсаветаў Магілеўскай акругі.

Пастанова ЦВК СССР аб перабудове работы саветаў не абмеркавана ніводным РВК, не гаворачы ўжо аб низавых зьвеньнях савецкага апарату.

Чавускі РВК па дакладу Ваўкавіскага сельсавету і двух калгасаў у сваёй пастанове ні слова не сказаў аб удзеле сельсавету ў калектывізацыі і, такім чынам, калгасы выпалі з-пад упливу сельсавету.

Сельсаветы Магілеўшчыны невыстарчальна энэргічна вядуць работу па арганізацыйным і матар'яльным замацаваньні калгасаў і наогул вытворчай дзейнасьці калгасаў.

Падольскі, Слабодзкі, Лазоўскі сельсаветы ў справе калектывізацыі абмежаваліся пераважна тым, што склалі сьпісы гаспадарак, якія ўвайшлі ў калгасы.

Сельсаветы ў радзе месц ня прымаюць удзелу ў складаньні і абмеркаваньні вытворчых плянаў калгасаў, правільнай арганізацыі працы, арганізацыі адыходніцтва на сэзонную работу.

На тэрыторыі Дубровіцкага сельсавету, Клімавіцкага раёну, ёсьць буйны калгас «Ленінскі Шлях», арганізаваны яшчэ ў мінулым годзе. Сельсавет ня толькі не кіраваў дзейнасьцю гэтага калгасу, але нават не заслухаў дакладу аб яго рабоце.

Азнаямленьне з работай некаторых сельсаветаў паказвае, што пры перавыбарах пытаньне аб узмацненьні складу сельсаветаў ва многіх мясцох станоўча ня вырашана.

У той-жа час у радзе раёнаў БССР ёсьць сельсаветы, якія палепшылі сваю работу ў сэнсе ахопу важнейшых палітычных і гаспадарчых кампаній. Мясцамі разгортваецца ажыўленая савецкая работа.

Прыклад такой работы дае **Бароўскі сельсавет, Мазырскай акругі.** Старшыня сельсавету—рабочы з Гомельскае акругі. Ня гледзячы на непрактычнасьць у савецкай рабоце і слабую дапамогу з боку вышэйшых савецкіх органаў, гэты старшыня сельсавету разам з усімі членамі савету надзвычай актыўны ўдзел прымае ў справе ўзмацненьня калгасу і правядзеньня веснавой пасеўнай кампаніі. Сваімі сіламі без дапамогі раёну Бароўскі сельсавет своечасова і правільна адвёў яровы клін тым аднадворнікам, зямля якіх адышла ў калгас, чым у значнай ступені дапамог сяўбе ўперад.

У плянах работы Нізаўскага сельсавету (Магілеўшчына) пытаньні кіраўніцтва работай калгасаў займаюць значнае месца.

Клімавіцкі РВК, Магілеўскае акругі, па справаздачы Лазавіцкага сельсавету даў дырэктыву сельсаветам паладзіць сталае кіраўніцтва калгасамі, асабліва ўмацаваньне іх, не паспабляючы работы па абагуленьні ў калгасах насенных фондаў, ачыстцы насеньня, зборы попелу.

Тут трэба адзначыць, што, на жаль, ёсьць выпадкі спробы падмены масавай работы саветаў адміністраваньнем. Прыяжджаючыя на месцы шматлікія ўпоўнаважаныя АВК, РВК часта ператвараюць сельсаветы ў свой тэхнічны апарат. РВК не ўвязваюць работы ўпоўнаважаных з чарговымі задачамі сельсаветаў, прабуючы замяніць апошнія ўпоўнаважанымі.

Адпаўленьне складу сельсаветаў выклікае патрэбнасьць узмацненьня інструктаваньня і кіраўніцтва. Ці ёсьць гэта жывое кі

Перад 1-м мая

Вялікі першамайскі карнавал у Менску

Саюз працаўнікоў мастацтва г. Менску разгарнуў шырокую падрыхтоўку да сьвяткаваньня 1-га мая. У часе першамайскай дэманстрацыі працаўнікі БДТ-2 капэляй наладжваюць вялікі карнавал з мастацкім афармленьнем. Карнавал будзе прасякнут палітычным зьместам, у ім будзе паказана, як міжнародная буржуазія рыхтуецца да крыжовага паходу супроць СССР, будуць дэманстрацыялістычнага будаўніцтва, як адказ на правакацыйныя выступленьні замежнай буржуазіі.

У мастацкім афармленьні тэй часткі карнавалу, якая адлюстроўвае нашае будаўніцтва, прымуць удзел усе профсаюзы. Так, калёна саюзу чыгуначнікаў будзе мець выгляд цягніка і вагонаў. Саюз рабсмлесу будзе прадстаўляць сабой вялікую калёну трактараў. Члены саюзу мэталістых будуць ісьці пад мастацка аформленымі лёзунгамі: «пяцігодку за чатыры гады» і г. д.

У карнавале прымуць удзел чырвонаармейскія часьці з усімі відамі зброі, як танкі, бранявікі, гарматы і г. д.

Саюз працаўнікоў мастацтва для лепшага правядзеньня карнавалу арганізаваў спэцыяльнае бюро кансультацыі, да ўсіх вялікіх клюбаў Менску прымацаваны мастакі, якія будуць кіраваць работаю па мастацкім упрыгожаньні клюбаў.

Гомель рыхтуецца

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Фабрыкі і заводы Гомельшчыны ўзмоцнена рыхтуюцца да дня 1-га мая. Так, фабрыка «Кастрычнік» выпускае спэцыяльны нумар насьценгазэты, прысьвечаны сьвяткаваньню 1-га мая і гадавіне сацыялістычнага спаборніцтва. 30-га красавіка адбудзецца агульна-фабрычны мітынг. Рабочыя зьвярнуцца да сябе на фабрыку делегацыю калгасьнікаў ад надшэфнага калгасу «Касьцюкоўка», Гомельскага раёну.

На швэйнай ф-цы «Камінтэрн» да першамайскай дэманстрацыі рыхтуецца вялікі палітычны карнавал. Ф-ка пасылае рабочыя дэлегацыі ў Менск, Бабруйск, Бежыцу і калгасы Ўваравіцкага раёну, апрача таго, запрашаюцца ў Гомель прадстаўнікі менскай швэйнай млыне і ф-цы «Кастрычнік».

Другая кніжка двух аўтараў — Шатэрніка і Шпіцэра «Першага мая ў піянэрскім атрадзе» — імкнецца паказаць, як практычна правесьці 1-га мая ў піянэрскім атрадзе. Аўтары практычна ўвязалі гэта сьвята з сучаснымі задачамі піянэраў у сацыялістычнай перабудове вёскі, у пасэўнай кампаніі і г. д. У кнізе дан матар'ял (п'еса, жывая газэта і матар'ял для голаснага чытаньня) для правядзеньня вечароў, прысьвечаных 1-му маю. Даны прыкладныя гульні на вечарох і г. д. Адсутнасьць матар'ялаў на сацыялістычным спаборніцтве, калектывізацыі і г. д. вьнімае каштоўнасьць данай кнігі, як кнігі, якая зьяўляецца адбіткам сённяшняга дня.

Трэцяя кніжка Мацісона — рэвалюцыйныя песьні «Майскі заклік», вып. II. Надовычай каштоўная па замысьле кніжка. Аўтар імкнуўся мастацкі афарміць сьвята, аздобіць яго мастацкімі сьпевамі. Ён узяў некалькі вершаў беларускіх паэтаў і пераклажыў іх на музыку. Зборнік сьпеваў прысьвечаны 1-му мая («Майскі заклік»), але сьпеваў з адпаведным зьместам усяго толькі адзін («Майскі заклік»). Рэшта зьяўляюцца сьпевамі па поваду: Ц. Гартнага «Ідуць гады», прысьвечаныя Парыскай камуне, Ясакар «Міжнародны сьпеў кабеты» і г. д.

ДАКУТОВІЧ.

Бібліяграфія

Літаратура да 1-га мая

На сённішні дзень мы маем усяго толькі 3 маленькія брашуры, выданыя Белдзяржвыдавецтвам, прысьвечаныя 1-му маю.

1. Баркоўскі «Першае мая на Беларусі», стар. 46, ц. 16 к.
2. Шатэрнік і Шпіцэр «Першае мая ў піянэрскім атрадзе», стар. 60, ц. 25 к.
3. Мацісон. Рэвалюцыйныя песьні «Майскі заклік», стар. 16, ц. 25 к.

Першая кніжка Баркоўскага «Першае мая на Беларусі» зьяўляецца спробай у гістарычным асьвятленьні паказаць клясавую сутнасьць сьвяткаваньня 1-га мая. Але аўтар, пачынаючы сваю кніжку уступам, няўдала даў мэтавую устаноўку сьвяткаваньня 1-га мая. Паводле Баркоўскага выходзіць, што у гэты дзень (1-га мая) пралетарыят толькі падлічвае свае сілы..., падлічвае свае дасягненьні (і аноў падкрэсьлена аўтарам), падлічвае свае сілы». У сваім уступе аўтар пэвыстарчыла падкрэсьліў сутнасьць міжнароднага пралетарскага сьвята, як сьвята БАРАЦЬБЫ сусьветнага пралетарыяту з капіталізмам, як сьвята БАРАЦЬБЫ за перамогу сацыялізму.

Гістарычныя факты паданы ў кнізе даволі добра. Недахопам данай кніжкі трэба лічыць тое, што аб сьвяткаваньні 1-га мая ў апошнія гады сёньня, напісана толькі некалькі радкоў на апошняй старонцы.

Да ведамы падпісчыкаў „Зьвязды"

З сёньняшнім нумарам газэты „Зьвязда" рассылаецца дармовы дадатак — **ГАЗЭТА „ПРАФРУХ" № 9**

Падпісчыкі! Пры атрыманьні (Першамайскі нумар) «Зьвязды» патрабуйце дадатак **„ПРАФРУХ"**

ПАСЬПЯШАЙЦЕСЯ падпісацца на „ЗЬВЯЗДУ"

на МАЙ і наступныя месяцы

ПАМЯТАЙЦЕ, што ў маі АДКРЫВАЕЦЦА

XIII ЗЬЕЗД КП(б)Б

РАБОТА ЗЬЕЗДУ БУДЗЕ АСЬВЯТЛЯЦЦА НА СТАРОНКАХ „ЗЬВЯЗДЫ"

Правілы прыёму у вячэрні сэктар

Камуністычнага Унівэрсытэту Беларусі імя У. І. Леніна на 1930-31 навучальн. год

I. Вячэрні сэктар Камуністычнага Унівэрсытэту ставіць сваёй задачай падрыхтоўку кіруючых партыйных, камсамольскіх савецкіх і вайсковых работнікаў пераважна для прамысловых раёнаў БССР, галоўным чынам, для Менскай акругі.

II. Вячэрні Сэктар Камуністычнага Унівэрсытэту мае натыры аддзяленьні.

1) **Партыйнае**—для падрыхтоўкі кіруючых кадраў для партыйна-арганізацыйнай, прафэсыйнай і масавай работы ў буйна-заводзкіх прадпрыемствах.

2) **Аддзяленьне вайсковага партактыву**—для павышэньня ўзроўню агульна-тэарэтычных і ваенна-палітычных ведаў старэйшага і сярэдняга камскладу ў аб'ёме скарочаных праграм ваенна-палітычнай Акадэміі імя Талмачова.

3) **Прапагандысцкае**—для падрыхтоўкі выкладчыкаў і прапагандыстых для марксыцка-ленінскіх гурткоў павышанага тыпу, вячэрніх сав. партшкол, вячэрніх рабфакаў, тэхнікумаў і г. д.

4) **Савецкае аддзяленьне**—падрыхтоўнае партыйныя кадры для кіруючай працы ў савецкім апараце (з разьлікам на іх вылучэньне).

УВАГА. Заняткі на прапагандысцкім аддзяленьні арганізаваны па 2-м цыклям. На нармальным цыклі заняткі вядуцца па ўсіх галінах грамадзкіх навук.

На павышаным цыклі прапрацоўка больш паглыбленая.

Студэнтамі вывучаецца адна галіна грамадзкай навукі (эканамічная, або гістарычная ці філёзофская).

Камплектаваньне па цыклях праходзіць асобна.

5. При вячэрнім сэктары КУБ'у арганізаваны курсы: а) камсамольскіх работнікаў, у задачы якіх уваходзіць падрыхтоўка кваліфікаваных камсамольскіх працаўнікоў раённага і акруговага маштабу;

б) курсы газэтных працаўнікоў рыхтуюць кіруючыя газэтныя кадры для друкаваных і пасьценных газэт фабрычна-заводзкіх прадпрыемстваў.

6. Тэрмін навучаньня на ўсіх аддзяленьнях 3-хгадовы з 6-ю самастойнымі сэмэстрамі, а на курсах 2-хгадовы, з 4-ма самастойнымі сэмэстрамі.

7. Заняткі вячэрніх а 6 з паловаю да 10 гадз. увечары, 5 раз у дэкаду. Для т. т., працуючых у зьменах, арганізуюцца асобныя групы з вячэрнімі і дзённымі заняткамі.

III. Вучоба ў вячэрнім сэктары Камуністычнага Унівэрсытэту прыраўноўваецца да выкананьня партабавязкаў і ў адпаведнасьці з гэтым ячэйкі і бюро калектыву КП(б)Б часьцей павінны сачыць за яе выкананьнем. Камандыруемыя ў вячэрні сэктар аслабаняюцца ад усіх партыйна-грамадзкіх нагрузак, акрамя паведваньня партсходаў, часткова скарыстаньня партарганізацыяй (але ня больш аднаго разу ў пяцідзёўку) і вядзеньня партпрактыкі, арганізуемай Камвузам. Катэгарычна забараняецца ячэйкам і раённым камітэтам без узгадненьня з бюро АК КП(б)Б і паліторганамі часьцей пасылка і перакідка студэнтаў.

На вячэрні сэктар прымаюцца т. т., адпавядаючыя наступным залатрабаваньням:

1) на аддзяленьне Партбудаўніцтва—Савецкае і вайсковае:

а) партстаж ня менш 2-х год, а для жанчын 1 год, які скончыўся да 1-га верасьня 1930 году.

б) 3-х гадовы вытворчы стаж;

в) узрост ад 22-35 год;

г) падрыхтоўка ня ніжэй аб'ёму вячэрняй савпартшколы 1-й ступені.

2) на прапагандысцкае аддзяленьне нармальнага цыклю прымаюцца выключна рабочыя, якія маюць:

а) 2-хгадовы партстаж і вопыт грамадзка-партыйнай працы;

б) вытворчы стаж ня менш 2-х год;

в) узрост не маладзей 25 год і не старэй 40 год;

г) папярэднюю марксыцка-ленінскую падрыхтоўку ў аб'ёме марксыцка-ленінскіх гурткоў.

3) на прапагандысцкае аддзяленьне павышанага цыклю вячэрняга сэктару на першы год навучаньня, г. зн. 1-шы і 2-гі сэмэстры ўмовы прыёму застаюцца, як і на нармальны цыкль, а на 3 і 4 сэмэстры прымаюцца т. т., якія маюць:

а) ня менш 3-х год партыйнага стажу і 2-х год вопыту кіруючай партыйнай і грамадзкай работы;

б) папярэднюю тэарытычную падрыхтоўку ў аб'ёме нармальнага вячэрняга камвузу і ўменьне бегла чытаць і пісаць на белмове (складаць тэзісы і канспэкты і рашаць арытмэтычныя задачы пад цэлымі чыслам і дробнымі.)

4) На вячэрнія курсы газэтных працаўнікоў прымаюцца т. т., якія маюць:

а) партстаж ня менш 1 году,

б) 2-х гадовы вытворчы стаж,

в) узрост не маладзей 20 год,

г) падрыхтоўку ня ніжэй аб'ёму адзінай школы палітграматы і ўменьне вольна чытаць і пісаць.

УВАГА: З членаў ЛКСМБ могуць быць прыняты т. т., якія маюць: а) камсамольскі стаж ня менш 3-х год, б) вытворчы стаж ня менш 2-х год, актыўныя працаўнікі рэдкалегій.

Кожная рэдкалегія друкаванай і насьценнай фабрычна-заводзкай газэты павінна камандыраваць на вячэрнія курсы газэтных працаўнікоў ня менш аднаго таварыша, узгадніўшы кандыдатуру камандыруемага з бюро яч. КП(б)Б.

5) На курсы камсамольскага актыву:

а) камсамольскі стаж ня менш 3-х год (пажадана членаў і кандыдатаў партыі).

б) ня менш аднаго году актыўнай камсамольскай работы,

в) 2-х гадовага вытворчага стажу фізычнай працы,

г) узрост ад 18 да 21 году,

д) падрыхтоўка ня ніжэй аб'ёму праграмы вячэрняй сав. парт. школы.

Па асобных прадметах для ўсіх паступаючых патрабуецца наступны аб'ем ведаў

1) **Па белмове:** уменьне бегла правільна і выразна чытаць у голас, граматна пісаць з захаваньнем асноўных правіл правапісу і ўменьне правільна фармуляваць (вусна і пісьмова) свае думкі.

2. **Па матэматыцы:** цьвёрда ведаць дзеяньні над цэлымі лічбамі, простымі і дзесятковымі дробамі, процантнага вылічэньня прапорцый; раменьне задач на прапарцыянальныя велічыні.

3. **Па геаграфіі:** пачатковыя веды па фізычнай і палітычнай геаграфіі, уменьне арыентавацца на геаграфічнай карце.

4. **Па палітычнай эканоміі:** веды палітычнай эканоміі ў аб'ёме падручніка Леонцьева «Пачатковы курс палітычнай эканоміі».

5. **Па гісторыі УсеКП(б)**—у аб'ёме падручніка Папова «Очерки по истории ВКП(б)».

6. Паступаючыя павінны таксама ўмець арыентавацца ў бягучых палітычных падзеях, правільна разумець пастановы партыйных зьезадаў, канфэрэнцый і пленумаў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б (у асаблівасьці апошніх зьезадаў і пленумаў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б.

Камплектаваньне праводзіцца па-за калектывамі і ячэйкамі па раскладцы раённых камітэтаў і падыву

Бюро раённых камітэтаў КП(б)Б, падывы абавязаны закончыць камплектаваньне не пазьней 1-га чэрвеня г. г.

1) Жадаючыя паступіць на вячэрні сэктар Камуністычнага Унівэрсытэту, праходзяць папярэднюю праверку ў адборачных камісіях пры райкомах у складзе: загадчыка культпрападдзелам (старшыні, загадчыка аргаддзелам і прадстаўніка ад сэктару масавае працы). Камісіі павінны ў сваёй працы кіравацца правілямі прыёму.

2) Парадак адбору кандыдатаў:

Усе жадаючыя паступіць у вячэрні сэктар Камунівэрсытэту не пазьней 10-га мая падаюць заявы ў бюро яч., дзе вырашаецца пытаньне аб магчымасьці дапусьціць іх у Камунівэрсытэт. Пасьля ўсе заявы накіраваных перадаюцца не пазьней 2-га мая ў раённыя адборачныя камісіі, якія к 1-му чэрвеня накіроўваюць матар'ялы адабраных у адборачную камісію пры Камунівэрсытэце, выдаўшы кароткія весткі згодна асабовага лістка, які будзе разасланы па райкомах.

УВАГА: Жадаючыя паступіць на Вайсковае аддзяленьне партактыву Вячэрняга сэктару КУБ праходзяць папярэднюю праверку ў адборачнай камісіі пры ДЧА ў складзе: загадчыка парт.-палітпрасьвет габ. (старшыні), прадстаўнікоў паліторганаў гарнізону і культпрападдзелу МАК КП(б)Б.

Парадак адбору кандыдатаў: усе жадаючыя паступіць у Вячэрні сэктар КУБ не пазьней 15-га мая падаюць заявы ў бюро яч. і ваенкомам, дзе вырашаецца пытаньне аб магчымасьці дапусьціць іх у Камунівэрсытэт, прычым апошнія нясуць адказнасьць за забесьпячэньне нармальнага праходжаньня курсу ў Камунівэрсытэце. Пасьля ўсе заявы з дадаткам кароткай характарыстыкі ад адпаведнай парт'ячэйкі і ваенкому перадаюцца не пазьней 25-га мая ў камісіі пры ДЧА, якія да 5-га чэрвеня накіроўваюць матар'ял у адборачную камісію пры Камунівэрсытэце.

3) Партарганізацыям і паліторганам неабходна разгрузіць т. т., прадстаўшыя ня менш 3-х вольных вечароў у 5-ку для папярэдняй падрыхтоўкі.

4) Дапушчаныя да іспытаў т. т. паведамляюцца аб гэтым райкомамі і паліторганамі не пазьней 15-га чэрвеня.

5) Прыём у вячэрні сэктар КУБ будзе ўтварацца з 15-га па 25-га жніўня, на вайсковае з 15-га—25 верасьня (Унівэрсытэцкая, 27, будынак Камвузу). Там-жа будуць праводзіцца і вучэбныя заняткі. Пачатак навучальнага году — 1-га верасьня 1930 году, а на вайсковым — 1-га кастрычніка 1930 г.

Па ўсіх пытаньнях прыёму і вучобы зварачацца да загадчыка або сакратара вячэрняга сэктару КУБ, тэл. 9-20, або 9-19, а на вайсковае да загадчыка ДЧА, тэл. 7-32.

РАЗЬМЕРКАВАНЬНЕ

месц у вячэрні сэктар Камуністычнага Унівэрсытэту Беларусі імя У. І. Леніна на аддзяленьні і курсы на 1930-31 нав. год.

№№ п.-п.	Назва аддзяленьняў і курсаў	Агульн. колк. месц.	Разьмеркаваньне па райкомах. Кастрычніцкі.	Фрунзаўскі.
1	Партыйнае	120	60	60
2	Савецкае	120	60	60
3	Прапагандысцкае	200	100	100
	з іх:			
	а) на нарм. цыкль	80	40	40
	б) гістарычны цыкль	40	20	20
	в) эканамічны	40	20	20
	г) філёзофскі	40	20	20
4	Курсы ЛКСМ актыву	90	45	45
5	Курсы газэтн. працаўн.	100	50	50
6	Аддз. вайск. партактыву	120		
7	Падрыхтоўчая група ў ВКУ для жанчын	80	40	40
	УСЯГО	830	355	355

УВАГА: 1) Кантынгэнт слухачоў на 1930-31 нав. год вызначаны 100 чалавек.

2) Райкомы дасылаюць у адборачную камісію пры Унівэрсытэце на 50 проц. больш патрабнага ліку, паводле разьмеркаваньня для адпаведнага адбору.

Сакратар Менскага Акругому КП(б)Б **Славінскі.**

Рэктар Кам. Ун-ту Бел. **Саевіч.**

Заг. Вячэрняга Сэктару Камунівэрсытэту **Аўчыньнікаў.**

ХРОНІКА

Назначэньні

СНК БССР назначыў т. Міцькова на месьнікам народнага камісара Зямляробства; тав. Філіпава членам прэзыдыуму Дзяржпляну, т. Машкова М. І.—членам калегіі НКЗ, т. Трандафілава А. Т. — членам калегіі НКЮ, т. Панава Н. А.—членам калегіі НКА і т. Файнбэрга памочнікам пракурора рэспублікі.

Экскурсіі ў Менск

Гэтымі днямі Менск наведала 60 вучняў койданаўскай сямігодкі, якія азнаёміліся з работай электра - станцыі, радыё-станцыі і іншых прадпрыемстваў.

На першамайскае сьвята ў Менск прыяжджае група вучняў Старобінскай сямігодкі ў 60 чалавек.

Масавая вылазка фота-аматараў

Фота-камісія пры ЦСПОВ і менскае таварыства фота-аматараў арганізуюць раніцою 2-га мая масавую фота-вылазку (маёўку) у раён стадыёну і ўсебеларускай выстаўкі. У часе вылазкі на прыпале будзе праведзена гадзіна пытаньняў і адказаў на фота-тэмы.

У часе першамайскай дэманстрацыі фота-лябараторыі ў доме працы адкрыта для ўсіх фота-аматараў для зьмены пласьцінак здымкаў асобных момантаў дэманстрацыі.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

3-га мая, а 18 з паловай гадз. веч., парттройка ЦК КП(б)Б разглядае справы наступных т. т. Крываносава Л. С., Гінзбурга Г. П., Каралькевіча М. М., Капялевіча А. П., Даўбешкіна Л. Я., Сапалаўёва Л. Д., Таўстога С. З., Шукайлы П. З., Коньніка Я. Я., Ларчынкава І. Ф., Цэпкава І. Т., Цірэнкі А. І., Прудзікава М. П., Курчанкова С. А., Зуевіча М. Ц., Шэляша Я. М., Гарбанова М. І., Каваленкі П. С., Максімава І. Я., Прапулевіча В. А., Салаўёва П. С., Фішара Н. Б., Сантаровіча Л. А., Ступакова М. Н., Шкурдзе В. А., Шабуні А. М.

Усе таварышы запрашаюцца для прыняцьця ўдзелу пры разглядзе іх справ. Праезд за ўласны кошт. Таксама запрашаюцца старшыні праверкомаў, якія праводзілі чыстку гэтых таварышоў, і сакратары ячэек, дзе знаходзяцца пералічаныя таварышы.

29 красавіка, а 18 з паловай гадз. вечары, у **памяшк.** МенАКК (Энгельса, 28) разглядаюцца справы наступных т. т.:

Лютарэвіча В. Я., Бэйнэнсона В. В., Краснасельскага Я. Г., (шпалерная ф-ка), Пятрова М. А. (камгас), Пасынкоўскага Н. Х., Ліпкера Я. І., (з-д «Бальшавік»), Шаптурэнкі І. В., Айтуховіча П. Ц., Беднага Я. Т., Лабанава В. С., Гольдбэрга С. А. і Кантаровіча С. З. (яч. ф-кі «Адраджэньне»), Ліхадзеэўскага І. Ф. К., Рубенчыка Я. І., Стэрлінга А. М. і Левіна А. Б. (яч. шчаціннай ф-кі), Дзінэрштэйна Е. Я. і Каханоўскай Ф. Л. (яч. п.-к. утылізацыі).

Акрамя вышэйназваных таварышоў, абавязкова павінны зьявіцца сакратары ячэек, у якіх знаходзяцца гэтыя таварышы, а таксама старшыні праверкомаў, якія правяралі гэтыя ячэйкі.

2-га мая, а 5 гадз., у залі пасяджэньняў гарсавету (клюб Мегарсавету, (Пляц Boni) склікаецца аб'яднаны закрыты партыйны сход ячэек: а) прыгараднага сельсавету; б) Бульбянай станцыі; в) Дасьледчага інстытуту імя Леніна; г) саўгасу імя Лекерта; д) саўгасу «Чырвоны Транспарт» і е) саўгасу «Воль ная Праца». Будзе заслухана справаздача райкому КП(б)Б за чэрвень 1929 г.—красавік 1930 г.

Куставы сход ячэек Белдзяржбуду, **будаўнічага аддзелу Белжылсаюзу, Гандальбуду, саюзу будаўнікоў, ВСНГБ, Белпайгандлю, Лесбелу, заводу «Дразваапрацоўшчык», ЦВК, Белдартрансу, аўта-кіраўніцтва, Абкамтрэсту, СНК і Дзяржпляну** пераносіцца на 29 красавіка ў клюб акрвыканкому (Пляц Boni). Пач. а 6 гадз.

Фрунзаўскі райком паведамляе, што 29 красавіка, а 6 гадз., у клюбе другароў працягваецца куставы сход наступных ячэек: друкарні БДВ, працкапектыву «Паліграф», парткапектыву рэдкаўкі, НКА, Акадэміі Навук, Працасьветы, БДТ2, Белдзяржкіно, Камвуз, палітэхнікум, мэтэхнікум, белпэдтэхнікум, шпалерная ф-ка. Парадак дня: даклад аб працы Фрунзаўскага райкому.

СЕНЬНЯ

Пушкінская б-ка. А 18 гадз. — дзіцячы вечар, прысьвечаны 1 мая. Запрашаюцца і бацькі дзяцей - чытачоў.

Клюб навуковых працаўнікоў. А 8 гадз. — пасядж. культурна - выторчага сэктару цэнтральнага бюро сэкцыі навуковых працаўнікоў.

Пэдгабінэт. Лекцыя інжынэра **Абакумава** для выкладчыкаў фізыкі па тэму «Тэхнічныя і фізычныя асновы пабудовы трамваю». Пач. а 7 гадз. у трамвайным парку (Доўгабродзкая вул.).

Клюб савецкіх і гандлёвых служачых. Першамайскі вечар. Даклад, мастацкая частка. У праграме выступленьні клюбных гурткоў і запрошаных артыстых. Білеты на калектывах.

ЗАЎТРА

Дом Асьветы. А 19 гадз. 30 м.—першамайскі вечар для асьветнікаў. Білеты па групкомах і мясцкомах.

Клюб саўгандальслужачых. Вечар для калектыву Дзяржбанку, групкому № 5 і інш. У праграме даклад і мастацкая частка.

Дом Камасьветы. А 8 гадз. веч. — **вечар партыйнага і камсамольскага актыву.** Даклад аб міжнародным становішчы і 1 маі. Пасьля дакладу — канцэртная частка і кіно.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

ТЫ ЯШЧЭ НЯ КУПІЎ БІЛЕТАЎ 4-й ПЕТАРЭІ АСОАВІЯХІМУ?

ТЫРАЖ

білетаў 4 разрада 4-й пётарэі Асоавіяхіму адбудзецца ў Менску 2—3 мая г. г.

БУДЗЕ РАЗЫГРАНА 3.000 выйгрышаў)—(НА СУМУ 45.074 руб.

БІЛЕТ КАШТУЕ 50 кап.

Сьпяшайцеся купіць білеты! Умацняйце абарону!

Білеты прадаюцца ў арганізацыях Асоавіяхіму.

УСІМ СТУДПРАФАРГАНІЗАЦЫЯМ БССР.

ЦБ Пралетстуду ЦСПСБ паведамляе, што 15 мая 1930 г. у гор. Менску

СКЛІКАЕЦЦА VI УСЕБЕЛАРУСКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ПРАЛЕТСТУДУ БССР

з наступнаю павесткаю дня:

1. Сацыялістычнае будаўніцтва і праблема культурнай рэвалюцыі. 2. Даклад ЦБПС, УсеЦСПС. 3. Даклад ЦБПС, ЦСПСБ. 4. Даклад НК Асьветы аб пралетстуду. 6. Розныя.

Модус прадстаўніцтва—1 дэлегат з правам рашаючага голасу ад 150 студэнтаў.

Іншагароднія дэлегаты павінны быць у Менску 15 мая.

ЦБ ПРАЛЕТСТУДУ.

Вышаў з друку і паступіў у продаж Р. МУРАШКА.-СЫН-раман у 5 частках. Стар. 536. Цана 3 р. 50 к.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

ТЭАТР і КІНО

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР Сезон 1929-1930 году (чацьверты) у Менску

Аўторак, 29 красавіка, для саюзу мэталістых

„Калі пяюць пеўні"

Рэшта білетаў у касе тэатру. Пачатак а 7 гадз.

КІНО-ТЭАТР Культура — ПРЭМ'ЕРА Выткорч. „Грузкіно" **БОГ ВАЙНЫ** (БЕЛЫЙ ВСАДНІК) у 6 частках. Зьвыш праграмы— кіно-штомесячнік «Беларусь Савецкая» № 4 выткорч. Белдзяржкіно. Пач. сэансу: а 7 г., 8 г. 30 м., 10 г. 15 м. Каса—ад 5 г. увеч.

КІНО Інтэрнацыянал — 3 прычыны валікага посьпеху 2-гі тыдзень 2-гі Выключна мастацкі фільм САВКІНО **ХТО ВІНАВАТЫ?** Зьвыш праграмы кіно-хроніка Савкіно № 15 Пач. 1 сэансу а 7 г. увеч. Каса—ад 5 г. На дзённыя сэансы каса ад 12 гадз. дня.

КІНО Пралетарый — 2-гі тыдзень 2-гі Мастацкі нямецкі фільм паводле навэлі Стафана Цвэйга **СТРАХ** у 8 частках. Пачатак 1 сэансу а 7 г. Каса адкрыта ад 5 гадз.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр" — МАСТАЦКІ ФІЛЬМ **ГАЛУБЫ ЭКСПРЭС** у 5 частках Пачатак 1-га сэансу а 2 г., 2-га—а 3 г. 30 м. Каса адкрыта з 12 гадз.

КІНО Спартак — БАЯВІКІ **„ЛЕОН КУТЮРЬЕ"** драма ў 6 частках. Пачатак а 7 г. 15 м., 9 г. і 10 г. 15 м. Каса—ад 5 гадз. 30 м.

Гэтымі днямі адбудуцца ГАСТРОЛІ **„БАТЫШЧ-ТОН"** О. В. і А. Г. ВЫНАХОДЦАЎ | ВЫКАХОДЦАЎ **ТУЛЬСКІЯ БАТЫШЧАВЫ.** Батышч-тон—адначасовая ігра на трох сырынках, рэялі і храматычнай гармоні. Пры ўдзеле артыстых „Мюзік-Хол" А. М. Карайна і Л. П. Луарына. Сьпевы і скокі рускай вёскі. Сачыце за афішамі.

Ів. ЦЬВІКЕВІЧ. **Анатомія, фізыялёгія і гігіена** Стар. 230. Цана 1 руб. Белдзяржвыдавецтва.

ДЗЯРЖГАНДБЕЛ КУПЛЯЕ ДЫВАНЫ: пэрсыдзкія, тэкінскія, каўкаскія, старыя ручной работы. Пры необходнасьці экспарт высылаецца для агляду. Зварачацца: Менск, пляц Волі, 7, тэл. 16-92, ДЗЯРЖГАНДБЕЛ.

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА Менск, Савецкая, 63.

Вышла з друку, паступіла ў продаж і рассылаецца падпісчыкам

„ПОЛЫМЯ"

Беларуская часопісь літаратуры, палітыкі, эканомікі, гісторыі, крытыкі.

№ 3 ЗА САКАВІК 1930 № 3

ЗЬМЕСТ

Цішка Гартны.—Зялёны шум. Аповесьць. Зьмітрок Астапенка.—З паэмы «Вясна зямлі». Вершы. І. Мінігэнна.—Дыктатура. Пьеса ў 4-х дзеях. (Канец). Перакл. з укр. В. Сташэўскі. Юлі Таўбін.—Два вершы. Сяргей Астрэйка.—Я стаяў ля дарог. Верш. Язэп Пранзэка. — Парабкі. Апавяданьне (З жыцьця Зах. Беларусі). М. Хведар віч.—Эскізы з арганізацыі калгасу. Вершы. М. Нікановіч.—У паўстанцаў. (Жывыя кавалкі з жыцьця жывых людзей). М. Віоськоні.—Замежная палітыка польскага фашызму. М. Карклін.—Пра новую рэформу крэдыту. Праф. С. Вальфсон.—Мова і клясавая барацьба. Н. Кабакоў.—Некалькі слоў пра творчасьць Ізі Харыка. Кнігапіс. Хроніка.

Яшчэ ня позна падпісацца на «ПОЛЫМЯ» на 1930 год.

Часопісь «ПОЛЫМЯ» выходзіць штомесяц—12 кніжак на год, памерам кожная ў 10—12 аркушаў.

У 1930 годзе падпісная цана зьніжана з 12 на 10 рублёў.

Умовы падпіскі

На 12 мес.	На 6 мес.	На 3 мес.
10 р.	5 р.	3 р.

Кошт асобнага нумару 1 рубель.

ПАДПІСЧЫКІ—якія ўнясуць пры падпісцы поўнасьцю 10 руб., атрымаюць на працягу 1930 году адразу дзьве часопісі—«ПОЛЫМЯ» і «Чырвоная Беларусь».

ПАДПІСЧЫКІ—на часопісь «ПОЛЫМЯ», якія падпісаліся на выплату атрымоўваюць камплект «ПОЛЫМЯ» за 1928 або 1929 год ДАРМОВА.

НА ВЫПЛАТУ МОЖНА ПАДПІСАЦЦА:

Гадавым падпісчыкам у 3 тэрміны: пры падпісцы—4 руб., да 1 лістапада—3 руб. і да 1 кастрычніка—3 руб.

Поўгадавым падпісчыкам у 2 тэрміны: пры падпісцы—3 руб. і да 1 чэрвеня—2 руб.

АД'ЯЖДЖАЮЧЫ Ў ВОДПУСК у дом АДПАЧЫНКУ, на КУРОРТ, атрымлівайце газ. **„ЗЬВЯЗДА"** па месцы знаходжаньня ў водпуску, паведаміўшы ў аддзел падпіскі газ. «ЗЬВЯЗДА» **ВАШ НОВЫ АДРАС.** Газэта будзе дасылацца па новым адрасе **без асобнай даплаты.**

СЬЦЯГІ да 1-майскіх сьвят

ПРАДАЮЦЦА Ў ТАВАРЫСТВЕ **„Прыхільнік дзяцей"** —Савецкая, 40, і ў магазыне т-ва—Ленінская, 26.

Згубленыя і ўкрадзеныя

наступныя дакуманты лічыць несапраўднымі:

Чл. біл. саюзу будаўнікоў № 6-42229 Пагарэлскага Ю. М. 748
Залік. кн. Эпштэйн Г. Л., выд. Менск. політэхнікумам 749
Наборн. кн. Бушмакінай Н. М., выд. ТПО МБВ 750
Чырвонаарм. кн. Дзятко Р. Т., выд. авіяротай 2 брыгады 751
Даведка аб працы Дзятко Р. Т., выд. ф-кай «Адраджэньне» 752
Наборн. кн. ТПО, выд. на імя Панаскіна С. 753
2 наборн. кн. Кажэўнікава А. С., выд. ТПО МБВ 755
Каманд. пасьведч. Лінда І. Я., выд. Мен. АК КП(б)Б 756
4 рахункі за пайводы ў Халопонічы на суму 27 р. 50 кап., выд. на імя Лінда І. Я. 757
Чл. біл. саюзу СГЛР № 2290 Мізінскага А. А. 758
Вайск. кн. Мізінскага А. А., выд. Койданаўск. ваен. адз. 759
Парт. біл. Мізінскага А. А., выд. Койданаўск. РК КП(б)Б 760
Пасьведч. Мізінскага А. А., выд. Менакрвыканкомам 761
Пасьведч. на права нашэньня зброі Мізінскага А. А., выд. Мен. АДПУ Бел. 762
Вайск. біл. Чэркасава Ф. М., выд. 192 палком 763
Даведка аб выбарч. правох Барада Л. А., выд. Мен. міліцыяй 764
Патэнт Барада Л. А., выд. Менакрфінадда. 765
Асабов. пасьведч. Канюшчыка А. І., выд. лінейнай к-рай 5 вуч. сл. пуці МВБ ч. 766
Пропуск на права хаджэньня на чыг. пуцях Канюшчыка А. І., выд. нач. варты ДТ АДПУ 767
Каан. кн. Леановіч С. Г., выд. ТПО МБВ ч. 768
Чл. кн. саюзу працасьветы Кагана Н. З. 769
Канд. карт. КП(б)Б Захаровіча П. М., выд. Самахвал. РК КП(б)Б 770
Мэтр. вып. Эпштэйн Б. Б., выд. Менск. ЗАГС'ам 771
Мэтр. вып. Эпштэйн М. Б., выд. Менск. ЗАГС'ам 772
Пашпарт кн. Барада Л. А., выд. Менсампрамкрадыт. 773
Чл. кн. за № 180 Хількевіча А. А., выд. ЦП саюзу СГЛР сокс. спэц. 774
Асабов. пасьведч. Кульбакінага С. М., выд. Бел. адз. вид-ва «Пітаньні працы». 775
Парт. біл. № 609460 Іванова Р. М., выд. Мен. АК КП(б)Б 776
Бірж. талён Хаменка В. Г., выд. Мен. біржай працы. 777

50 к. кошт публікацыі аб згубе дакумента

Друкарня газэты «Зьвязда» Менск.